

# «БЕЛАРУСЫ СПАЎНА ВЫКАРЫСТАЛІ СВОЙ ГІСТАРЫЧНЫ ШАНЦ»

**Напярэдадні Дня народнага адзінства Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды**

Стар. 2–3

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ВЕРАСНЯ 2025 г. СЕРАДА № 179 (30567)

# УРАЧЫСТАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЯДНАННЯ

***Дарагія беларусы!***

Сардэчна віншую вас з Днём народнага адзінства.

Гэта свята з'яўляецца сімвалам аднаўлення гістарычнай справядлівасці і нацыянальнага яднання, якія паслужылі асновай развіцця і ўмацавання суверэннай беларускай дзяржаўнасці.

17 верасня 1939 года падзелены супраць волі народ нашай краіны здабыў цэласнасць і свабоду, што дазволіла беларусам стаць паўнапраўнымі гаспадарамі сваёй зямлі.

Дзякуючы аб'яднанню мы захавалі свае ідэнтычнасць і спрадвечныя духоўныя каштоўнасці, адстаялі ў Вялікай Айчыннай вайне права на мірнае жыццё, якое адрадзілі і ўпэўнена працягваем.

Перакананы, што мудрасць і традыцыі папярэдніх пакаленняў, адданасць Радзіме і згода ў грамадстве будуць заўсёды згуртоўваць нас у імя працвітання роднай Беларусі.

Шчыра жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ШТО ПІСАЛА «ЗВЯЗДА» АБ ПАДЗЕЯХ 17 ВЕРАСНЯ 1939 ГОДА? **10**


Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК і МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

# ГАВАРЫЦЬ. НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

**«Бяроза-Картузская» — яшчэ адно месца ўсебеларускай памяці**

Дзве калоны ішлі насустрач — адна з Усходу Беларусі, з Мінска, другая з Захаду, з боку Брэста. Яны сустрэліся каля моста на ўездзе ў горад Бяроза Брэсцкай вобласці. Чаму менавіта тут? Гэтыя мясціны сталі сімвалам змагання заходніх беларусаў за свае правы і ўз'яднанне народа, а цяпер яшчэ і адным з сімвалаў Дня народнага адзінства. СТАР. 6




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ISSN 1990 — 763X
25179>

# «БЕЛАРУСЫ СПАЎНА ВЫКАРЫСТАЛІ

## Напярэдадні Дня народнага адзінства



**Па традыцыі, напярэдадні найважнейшых дзён краіны аддаюць даніну павагі яе грамадзянам, якія кожны дзень робяць жыццё ў Беларусі найлепшым, а яе саму — наймацнейшай. Традыцыйная ўрачыстая цырымонія з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прайшла ў Палацы Незалежнасці, дзе ён уручыў дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам розных прафесій.**

«Напярэдадні Дня народнага адзінства мы ўшаноўваем нашых суайчыннікаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё краіны, ва ўмацаванне яе суверэнітэту і абараназдольнасці, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта свята з'яўляецца, па сутнасці, краевугольным каменем згуртаванасці і адзінства нацыі і разам з Днём Перамогі і Днём Незалежнасці, несумненна, стаіць у шэрагу галоўных дзяржаўных свят Беларусі. З вышыні пражытых дзесяцігоддзяў дзень 17 верасня 39-га года мінулага стагоддзя, калі была сцёртая штучная ганебная мяжа паміж Заходняй і Усходняй Беларуссю, успрымаецца як акт аднаўлення гістарычнай справядлівасці. Так яно і было. І як адзін з паваротных момантаў у летапісе беларускай дзяржаўнасці, які трывала звязаў нябачнай сувяззю эпохі і пакаленні».

Прэзідэнт заявіў, што, уз'яднаўшыся, беларусы спаўна выкарысталі свой гістарычны шанц, стаўшы высокаадукаванай, культурнай нацыяй, якая пабудавала ўласную суверэнную дзяржаву і заняла годнае месца сярод народаў нашай планеты.

«І сёння, уручаючы заслужаныя ўзнагароды вам — работнікам прамысловасці, будаўнікам, працаўнікам вёскі, ваенным, праваахоўнікам, дзеячам культуры, спартсменам, — мы працягваем эстафету пакаленняў, умацоўваем сувязь часоў і наша адзінства, — звярнуўся да герояў дня кіраўнік дзяржавы. — Я вітаю ўсіх вас і ўсіх працаўнікоў, якія кожны дзень ствараюць наша жыццё. Лечаць, вучаць, будуюць, выпрабляюць прадукты харчавання, тавары народнага спажывання, тэхніку. Даюць ваду і цяпло ў дамы, падтрымліваюць парадак на вуліцах гарадоў і вёсак. Прыемна бачыць сярод узнагароджаных аграрыяў. Карыстаючыся выпадкам, у вашай асобе вітаю ўсіх вяскоўцаў, якія завяршаюць сельскагаспадарчы год з вельмі годным вынікам».

Высокіх дзяржаўных узнагарод і званняў удастоены навукоўцы, педагогі, юрысты, артысты. Па словах беларускага лідара, цяжка пераацаніць іх унёсак у захаванне маральных каштоўнасцяў, культурных традыцый, выхаванне падрастаючага пакалення. Асаблівыя словы падзякі Аляксандр Лукашэнка адрасаваў людзям у пагонах — ваенным і супрацоўнікам праваахоўных органаў, якія стаяць на варце суверэнітэту, міру і грамадскай згоды і без удзелу якіх ніякая стваральная праца проста немагчымая.



# «АТРЫМАЦЬ УЗНАГАРОДУ З РУК ПРЭЗІДЭНТА

## Сваімі сакрэтамі майстэрства, крыніцамі натхнення,

**Віталь ГАРАЖАНКІН:**

### «ГАЛОЎНАЯ ЎЗНАГАРОДА — ЖЫЦЦЁ АРЦЁМА»

Пенсіянер Віталь Гаражанкін узнагароджаны медалём «За выратаванне жыцця». Адным непагодлівым днём, вяртаючыся дадому праз парк, убачыў у палонцы на раце чалавека. «Я папоўз па лёдзе, выцягнуў акуратна яго. Гэта быў хлопчык. На шчасце, хутка пад'ехалі ратавальнікі, якія аказалі яму дапамогу. Я ў гэты момант зусім не думаў, што таксама магу загінуць, я думаў толькі пра тое, каб яго выратаваць. Потым мы сустракаліся, Арцём — добры хлопчык. І для мяне галоўная ўзнагарода — тое, што цяпер Арцём жывы здаровы, вучыцца, развіваецца. Але і атрымаць узнагароду з рук Прэзідэнта — гэта вельмі ганарова і хвалюючa», — падзяліўся Віталь Гаражанкін.

**Аляксандр ТУЛІ:**

### «УСЁ МАЁ ЖЫЦЦЁ — ГЭТА СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА»

Аляксандру Тулі, дырэктару ААТ «Дзембрава» Шчучынскага раёна прысвоена званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». У прафесіі ён ужо 34 гады, з іх 17 гадоў — кіраўнік гаспадаркі.

«Усё маё жыццё — гэта сельская гаспадарка. Бацькі таксама працавалі ў вёсцы: бацька — механізатар, маці — даярка. Усё гэта мне знаёма з дзяцінства. І я дагэтуль радуюся, што працую ў гэтай сферы, выбар зроблены правільна, — дзеліцца ён. — Я памятаю, якой наша сельская гаспадарка была ў пачатку 1990-х, але дзякуючы мудрай палітыцы нашай дзяржавы, дзякуючы працавітасці нашых людзей на месцах у нас атрымліваецца дасягнуць выніку».

Аляксандр Тулі падзяліўся і сваімі крыніцамі натхнення. Адна з іх — наведванне Палаца Незалежнасці, а таксама сустрэчы з Прэзідэнтам. «У 2001 годзе, калі я яшчэ працаваў галоўным аграномам, нашу гаспадарку наведваў Аляксандр Рыгоравіч. Ён павітаўся, руку пацісну, і справа пайшла. Сёння дзякуючы зладжанай рабоце нашага калектыву спецыялістаў, якія разумеюць, дзеля чаго жывуць і працуюць, у нас атрымліваецца з году ў год паляпшаць вынік», — падзяліўся Аляксандр Тулі. Паводле яго слоў, сакрэт паспяховай працы аграрыяў заключаецца ў тым, каб працаваць «не па падручніку», а разумець і аб'ектыўна ацэньваць абстаноўку. «У нас ёсць тэхніка, тэхналогіі, веды. Ад нас патрабуецца толькі адказная і якасная праца», — рэзюмаваў дырэктар гаспадаркі.

**Ілья ШЫМАНОВІЧ:**

### «Я ДАГЭТУЛЬ НЕ ВЕДАЮ СВАЙГО МАКСІМУМУ»

«Мэты стаць заслужаным майстрам спорту напачатку сваёй кар'еры я і не ставіў, бо тады не ведаў, што гэта такое. Жыў «па сродках», з году ў год паляпшаючы свае вынікі, ішоў наперад. Проста ішоў да свайго максімуму, а які ён будзе, мы ж не ведаем. І я дагэтуль не ведаю свайго максімуму. Званне «Заслужаны майстар спорту» — гэта адна з мэт, якой я ў сваёй спартыўнай кар'еры дасягнуў, але гэта не адмяняе таго, што мне трэба ісці далей, — падзяліўся чэмпіён свету, прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы, уладальнік сусветных рэкордаў у плаванні брасам. — Гэта званне ў першую чаргу заслуга майго трэнера, з якім мы як пачалі працаваць 21 год таму, так і да гэтага ча-

# СВОЙ ГІСТАРЫЧНЫ ШАНЦ»

## Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды

«Дарагія сябры! Ад усяго сэрца віншую вас з заслужанымі ўзнагародамі! Вы робіце нашу краіну бяспечнай, зручнай і камфортнай. Дзякую за працу, за адданасць прафесіі і роднай Беларусі», — сказаў Прэзідэнт. Ён павіншаваў усіх з Днём народнага адзінства і пажадаў здароўя, міру, дабра і новых здзяйсненняў на карысць нашай Айчыны.

### «МЫ НІКОМУ НЕ ПАГРАЖАЕМ!»

Пасля ўрачыстасцяў Прэзідэнт выказаўся і на надзённыя тэмы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў яшчэ раз — мы, беларусы, нікому не пагражаем, асабліва суседзям. «Праўда, Аляксандру Рыгоравічу Вальфовічу (дзяржсакратару Савета Бяспекі. — **«Зв.»**) хачу сказаць, што хопіць нам апраўдвацца перад імі — ваюем мы, не ваюем супраць іх... Мы сказалі ім адзін раз, і дастаткова. Я думаю, яны нас пачулі. Усе (не дурні) разумеюць. Колькі б мы раз ні казалі. Мы здольныя даць адказ любому агрэсару. Нікога не стараемся заваяваць, бо не зможам гэта зрабіць, што мы выдатна разумеем. Вакол нас моцныя дзяржавы, што тут казаць. Але непрымальную шкоду мы заўсёды гатовыя нанесці, калі хтосьці ступіць на нашу зямлю», — падкрэсліў беларускі лідар.



**Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын атрымаў з рук Прэзідэнта ордэн Айчыны III ступені (гэтай узнагароды цяперашні кіраўнік урада быў удастоены 11 снежня 2024 года згодна з Указам № 462, калі займаў пасаду старшыні Мінскага аблвыканкама)**

Прэзідэнт акцэнтаваў, што беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2025», якія ў гэтыя дні праходзяць на тэрыторыі Беларусі, — планавыя. «Мы адпрацоўваем там усё (яны таксама гэта ведаюць, мы не ўтойваем), ад стральбы са звычайнай стралковай зброі і да атамных боегаловак. Зноў жа, мы павінны ўмець гэта ўсё рабіць, у адваротным выпадку навошта яно на тэрыторыі Беларусі. Але ні ў якім выпадку не збіраемся гэтым пагражаць. А калі камусьці трэба апраўдаць свае дзеянні — ашалелым, якія тут па суседстве жывуць, — гэта іх праблемы. Няхай падманваюць свой народ, гэта да пары да часу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, палякі, латышы — разумныя людзі, якія разбяруцца, у чым праблема. «Як разабраліся ўкраінцы, дарэчы. Мы ад іх менш праблем маем, хоць там ідзе вайна», — заўважыў беларускі лідар.

Звяртаючыся да ваеннаслужачых, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу: быць заўсёды напагатове. Па яго словах, расіяне сёння могуць многае і гатовыя перадаваць свае навыкі і падрыхтоўку. «Мы павінны вучыцца. Калі хочам жыць, мы павінны ўмець усё. Гэта я звяртаюся як ваенны да ваеннаслужачых», — сказаў Прэзідэнт. І нагадаў, што фізічная падрыхтоўка для вайскоўцаў — гэта галоўнае, таксама важна ўмець валодаць зброяй.

Прэзідэнт звярнуў увагу і на беспілотнікі. Па яго словах, трэба навучыцца з імі змагацца. «Мы павінны ўмець адхіляць ад цэлі любы беспілотнік, які працуе на любой частаце. Гэта наша школа. У сваце гэтаму навучыліся. Акрамя таго, што запускаць ракеты, падрываць, біць... Трэба ўмець абараняцца. Як толькі навучымся працаваць з беспілотнікамі, цэлая эра імгнення сыдзе ў нябыт. І мы перастанем маліцца на гэтыя беспілотнікі», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што да ўсяго, што сёння залятае ў Польшчу ці Літву, беларускі бок не мае ніякага дачынення. «І калі б мы так, як яны, вылі пасля кожнага залёту да нас беспілотнікаў з боку Украіны, Расіі, праз Польшчу там, Літву... Мы ніколі гэтага не рабілі. Мы спакойна рэагуем па адпаведных лініях, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Яны завылі пасля таго, як мы палову беспілотнікаў збілі, не ведаючы, чые яны, якія... Збілі — і ўсё. Некалькі штук мы не змаглі паразіць. Мы патрацілі велізарныя сродкі, каб знішчыць гэтыя беспілотнікі, якія ляцелі не да нас — ляцелі ў Польшчу. І мы паведамілі, колькі іх, куды ляцяць. Мы таксама не ведалі, чые яны: «Працуйце!» Яны гэта прызнаюць. Тым не менш паскудзяць. Значыць, у іх ёсць нейкія задумы. Мы павінны іх разгадаць. Мы іх разгадалі. І павінны гэтаму супрацьстаяць. Нікому нічога не тлумачачы».



# ВЕЛЬМІ ГАНАРОВА І ХВАЛЮЮЧА»

## планамі героі дня падзяліліся з журналістамі

су ідзём разам. Вялікі дзякуй хачу сказаць сям'і, якая заўсёды мяне падтрымлівала і не ўмешвалася ў маю кар'еру. І камандзе, якая заўсёды са мной побач, якая забяспечвае падтрымку і псіхалагічную разгрузку».

Сезон у плыўцоў толькі пачынаецца. І пакуль дакладна цяжка сказаць, якія будуць спаборніцтвы, бо каляндар пастаянна мяняецца. Па словах спартсмена, гэта крыху выбівае з каляі. «Але цяпер я жыву іншымі радасцямі, нядаўна я стаў бацькам. Дакладна ведаю, што вельмі важным стартам у гэтым сезоне будзе кубак наймацнейшых, які пройдзе ў Мінску. Прыемна, што гэтыя старты будуць дома. З астатнімі — пакуль шмат пытанняў, усё як звычайна — чыстая імправізацыя. Але я заўсёды гатовы да рэкордаў, я заўсёды імкнуся выступаць на максімуме», — прызнаўся Ілья Шымановіч.

**Анастасія ШКУРДАЙ:**

### «ЗВЫШМЭТА — АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ»

Чэмпіёнка Еўропы і прызёр чэмпіянату свету па плаванні прызналася, што прысваенне звання «Заслужаны майстар спорту» стала для яе хвалюючай нечаканасцю. «Маёй мэтай і задачай нумар адзін заўсёды было заваяваць як мага больш медалёў на розных спаборніцтвах і паказаць свой найлепшы вынік. Званне «Заслужанага майстра спорту» — гэта для мяне вялікі і прыемны бонус і пэўнае прызнанне. Мая звышмэта — Алімпійскія гульні ў 2028 годзе. І цяпер усе намаганні, думкі, сілы накіроўваю туды. Імкнуся палепшыць свае паказчыкі і навыкі, бо Алімпійскія гульні нязменна застаюцца галоўнай мэтай. І я дзякую людзям, якія былі са мной раней на маім спартыўным шляху, людзям, якія цяпер мне дапамагаюць. Каб іх усіх пералічыць, трэба вельмі шмат часу. Баюся нават кагосьці пакрыўдзіць і не назваць, таму што сапраўды вельмі шмат людзей мне дапамагаюць і мяне падтрымліваюць», — прызналася Анастасія Шкурдай.

**Уладзімір КАСЯНКОЎ:**

### «ГАЛОЎНАЕ — ЛЮБІЦЬ ЛЕС»

Дырэктар Клічаўскага лясгаса Уладзімір Касянкоў з гэтага часу мае званне «Заслужаны лесавод Рэспублікі Беларусь». У галіне ён працуе з 1988 года. «На жаль, у дырэктара рэдка атрымліваецца ездзіць у лес, бо калектыў вялікі, 400 чалавек, пытанняў шмат, і папяровай працы хапае. Задачы перад лясной ахоўвай стаяць сур'ёзныя. Праца лесавода вельмі няпростая, але ў нас дастойная зарплата, ёсць тэхніка, тэхналогіі. Аднак галоўнае ў нашай рабоце — гэта чалавек, які любіць лес», — адзначыў Уладзімір Касянкоў.

### ПРЭЗІДЭНТ ПЕРАД СВЯТАМ ПАМІЛАВАЎ 25 ЧАЛАВЕК

Напярэдадні Дня народнага адзінства Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб памілаванні 25 чалавек, асуджаных у тым ліку за злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 16 верасня, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Сярод памілаваных 12 жанчын і 13 мужчын; 19 чалавек ва ўзросце да 40 гадоў. У многіх з іх ёсць дзеці, а адна асуджаная з'яўляецца шматдзетнай маці. Адзін з памілаваных учыніў злачынства ў непаўналетнім узросце.

Усе яны прызналі віну і раскаяліся ў зробленым, узялі абавязацельствы весці законапаслухмяны лад жыцця.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА.**

# НЕ ТОЛЬКІ ПАДВЕСЦІ ВЫНІКІ, АЛЕ І ЗАКЛАСЦІ ТРЫВАЛЫ ПРАВАВЫ ПАДМУРАК НА БУДУЧЫНЮ

## З выступлення Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі КАЧАНАВАЙ на адкрыцці чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання

«Бягучая сесія, якая звязвае адыходзячую пяцігодку з новай, з'яўляецца адказнай і змястоўнай. Гэта пераходны этап, на якім важна не толькі падвесці вынікі праведзенай работы, але і закласці трывалы прававы фундамент для будучага развіцця.



Менавіта цяпер неабходна максімальна ўзважана падыходзіць да кожнага законапраекта, улічваючы меркаванні ўсіх зацікаўленых бакоў, пазбягаючы фармалізму. Толькі так можна забяспечыць пераемнасць, устойлівасць і эфектыўнасць заканадаўчай базы, якая адпавядае інтарэсам грамадства і выклікам часу.

Гэтыя пасылы трэба ўлічваць пры рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігадовы перыяд, праект якой, у адпаведнасці з Канстытуцыяй, будзе разгледжаны на Усебеларускім народным сходзе. Наша зона адказнасці ў гэтай рабоце — перш за ўсё ўдасканаленне заканадаўства з улікам нацыянальных інтарэсаў, канкрэтных запытаў насельніцтва і мэтавых задач, сфармуляваных Прэзідэнтам краіны.

Паспяховы старт новай пяцігодкі ў многім залежыць ад збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, эфектыўнасці іх расходавання. Неабходна з асаблівай дбайнасцю падысці да разгляду адпаведнага законапраекта і карэкціроўкі Падатковага кодэкса. Асноўныя прыярытэты бюджэтнай палітыкі застаюцца нязменнымі: фінансаванне ў поўным аб'ёме сацыяльных праграм, рост заробкаў, устойлівае развіццё рэгіёнаў, своечасовае абслугоўванне дзяржаўнага доўгу.

У партфелі членаў Савета Рэспублікі таксама знаходзяцца законапраекты, накіраваныя на ўдасканаленне законаў аб энергазберажэнні, дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання. Важна, каб у цэнтры нарматворчага працэсу заўсёды заставаліся нацыянальныя інтарэсы і надзённыя праблемы і запатрабаванні грамадзян. За кожным радком заканадаўчага акта мы павінны бачыць чалавека.

Пастаянным камісіям неабходна выкарыстоўваць розныя формы работы — на сістэмнай аснове праводзіць выязныя пасяджэнні, круглыя сталы, на якія з удзелам шырокага кола зацікаўленых абмяркоўваць прававыя навелы, ажыццяўляць маніторынг рэалізацыі законаў на практыцы.

У сучасным турбулентным свеце асаблівае значэнне для забеспячэння нацыянальнай бяспекі, устойлівага развіцця эканомікі, прасоўвання дзяржаўных інтарэсаў набывае ўмацаванне міжнародных сувязяў. Наш Прэзідэнт, які валодае неверагодным палітычнай інтуіцыяй і вялікім палітычным вопытам, на сваім прыкладзе паказвае, як трэба выбудоўваць адносіны з краінамі, якія нацэлены канструктыўна супрацоўнічаць з Рэспублікай Беларусь.

Інструментарый для папулярызацыі знешнепалітычных і эканамічных інтарэсаў Беларусі ў нашага Парламента шырокі — у восьмым скліканні сфарміравана 10 дэлегацый для работы ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях, 6 міжпарламенцкіх камісій і камітэтаў, у тым ліку высокага ўзроўню, 42 краінавыя рабочыя групы. Значна пашырэла прысутнасць Нацыянальнага сходу ў міждзяржаўных парламенцкіх аб'яднаннях. Гэта пацвярджае атрыманы намі статус наглядальніка ў Панафрыканскім парламенце, у Азіяцкай парламенцкай асамблеі. Прапрацоўваецца пытанне аб атрыманні такога статута ў Арабскім парламенце.

Пераканаўча прашу ўсіх членаў Савета Рэспублікі — на міжпарламенцкіх пляцоўках, у ходзе замежных камандзіровак, патрабаванні да эфектыўнасці якіх будуць толькі павышаца, — актыўна транслюйце ідэі аб кансалідацыі намаганняў парламентарыяў для вырашэння глабальных задач, прасоўвайце міралюбівы імідж Беларусі. Наш святы абавязак — даносіць пазіцыю Беларусі як адказнага і канструктыўнага ўдзельніка міжнароднага дыялогу.

**Ключавая задача для членаў Савета Рэспублікі, усяго дэпутацкага корпуса і перш за ўсё старшынь сельскіх Саветаў — пастаянны маніторынг сітуацыі на месцах, аператыўнае рэагаванне на праблемы, якія ўзнімаюць грамадзяне. Мы павінны ведаць, чым жыве нават самая маленькая вёска, дзе засталося ўсяго некалькі жыхароў. Ствараць умовы для іх камфортнага жыцця мы абавязаны.**

Сімвалічна, што наша сесія пачынае сваю работу напярэдадні дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства. У яго аснове — не толькі гістарычная, але і духоўная супольнасць нашага шматнацыянальнага народа. Беларусь прайшла праз мноства выпрабаванняў, якія пераадолела дзякуючы народнаму адзінству — галоўнай апоры дзяржавы.

Свята аб'ядноўвае ўсіх, хто любіць сваю Радзіму, паважае яе гісторыю і шматвяковыя традыцыі. Упэўнена, што толькі разам мы зможам рэалізаваць пастаўленыя задачы, забяспечым устойлівае развіццё, абаронім суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны. Зробім усё, каб беларусы і надалей жылі мірна і з упэўненасцю глядзелі ў будучыню».

# БЕЗУМОЎНЫ ПРЫЯРЫТЭТ — НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І АБАРАНАЗДОЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСІ

## З выступлення Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара СЕРГЯЕНКІ на адкрыцці трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання

«Сесія адкрываецца напярэдадні Дня народнага адзінства — свята, якое займае важнае месца ў сэрцах беларусаў, з'яўляецца сімвалам нацыянальнай дзяржаўнасці, гонару за краіну і яе дасягненні.



Высокая ступень адказнасці за развіццё Беларусі ўскладзена на дэпутатаў. Кіраўнік дзяржавы паставіў перад намі сур'ёзныя задачы, падкрэсліўшы асаблівую значнасць прадаўжэння пастаяннага дыялогу з выбаршчыкамі.

Неабходна трымаць руку на пульсе грамадскага жыцця, бачыць і вырашаць праблемы, якія хваляюць грамадзян. Менавіта ў гэтым залог даверу народа да дзяржаўных інстытутаў і захавання яго адзінства.

**Безумоўны прыярытэт заканадаўчай дзейнасці — забеспячэнне незалежнасці і абараназдольнасці дзяржавы. Беларусь працягвае выступаць донарам рэгіянальнай бяспекі. Аднак мілітарызацыя Еўропы стварае прамыя ваенныя пагрозы ёй і Саюзнай дзяржаве, таму мы працягнем паслядоўную працу па ўмацаванні сілавога блока.**

Нацыянальная бяспека цесна спалучана з абаронай эканамічнага суверэнітэту. Сёння завяршаецца распрацоўка прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026 год. І пры абмеркаванні пакета бюджэтна-падатковых дакументаў неабходна прааналізаваць, наколькі эфектыўна створаныя прававыя ўмовы будуць садзейнічаць актывізацыі дзелавой ініцыятывы і выкананню сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы.

Упершыню на ўзроўні закона будуць комплексна перагледжаны ўсе пытанні, звязаныя з рэгістрацыяй і ліквідацыяй суб'ектаў гаспадарання. Трэба таксама разгледзець шэраг законапраектаў, якія датычацца жыццезабеспячэння краіны і яе насельніцтва.

Адначасова будуць прыняты меры па аптымізацыі заканадаўчага працэсу. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, каб мы часцей запрашалі спецыялістаў міністэрстваў, ведамстваў і разам знаходзілі канкрэтныя рашэнні. Падобная практыка будзе працягнута.

У мэтах падтрымання належнай якасці і аператыўнасці прыняцця законапраектаў мэтазгодна падключацца да іх падрыхтоўкі на самых ранніх стадыях. У такім фармаце павінна ісці работа над праектамі па пытаннях працоўных і жыллёвых адносін, таварных біржаў, правоў спажыўцоў.

Трэба прадоўжыць аналіз практыкі правапрымянення. Гэты рэсурс будзе задзейнічаны для рэалізацыі заканадаўчых ініцыятыў, запатрабаваных грамадствам і дзяржавай.

Значным новаўвядзеннем стане ўнясенне змяненняў у Закон аб нарматыўных прававых актах, якімі прапануецца надзяліць Палату прадстаўнікоў паўнамоцтвамі па кантролі за рэалізацыяй заключных палажэнняў прынятых законаў.

Прыярытэтамі міжнароднай дзейнасці дэпутатаў застаюцца прасоўванне міралюбівага знешнепалітычнага курсу і рэалізацыя дасягнутых дамоўленасцяў. І асноўны акцэнт робіцца на эканамічным складальніку.

Адзін з галоўных кірункаў — паглыбленне беларуска-расійскай інтэграцыі: рэалізацыя адзінай прамысловай палітыкі, развіццё міжрэгіянальных сувязяў, забеспячэнне роўных правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, процідзеянне знешнім выклікам і пагрозам, патрыятычнае выхаванне моладзі і барацьба з фальсіфікацыяй гісторыі.

Знакавай падзеяй міжсесійнага перыяду стаў Парламенцкі форум БРІКС, які прайшоў у Бразіліі, дзе была прадстаўлена пазіцыя Беларусі па найважнейшых гандлёва-эканамічных тэмах, пытаннях глабальнай бяспекі і паглыбленні парламенцкага супрацоўніцтва.

Мы працягнем нарошчваць намаганні па развіцці адносін з краінамі далёкай дугі і напаўняць гэты дыялог прадметным зместам. Нашы госці праяўляюць цікавасць да вопыту Беларусі ў сферах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, і важна канвертаваць яго ў канкрэтныя праекты.

У Міжпарламенцкім саюзе і ПА АБСЕ галоўнымі задачамі застаюцца адстойванне прынцыповых падыходаў да сусветных працэсаў, прасоўванне антысанкцыйнага парадку дня і нармалізацыя адносін з парламентарыямі заходніх краін.

У выбарчых акругах трэба засяродзіцца на аналізе інфармацыі аб развіцці сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай сітуацыі, вывучэнні фактараў, якія выклікаюць занепакоенасць грамадзян (цэны, арганізацыя сістэмы ЖКГ і гандлю, медабслугоўванне, электра- і газазабеспячэнне).

Па-ранейшаму актуальная задача правядзення інфармацыйна-тлумачальнай работы. У цэлым дэпутаты павінны быць разам са сваімі выбаршчыкамі, падтрымліваць адваротную сувязь, знаходзіць і выкарыстоўваць новыя формы камунікацыі з грамадствам».

Поўны тэкст выступленняў спікераў – на сайце zvizda.by

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

## НАТАЛЛЯ КАЧАНАВА ПРАВЯДЗЕ ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН

23 верасня Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у г. Мінску (вул. Чырвонаармейская, 9) .

Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 17 і 18 верасня па тэлефонах: 8 (017) 222-66-94, 8 (017) 327-28-91.

## УЛАДЗІСЛАЎ ТАТАРЫНОВІЧ — НАМЕСНІК СТАРШЫНІ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

Ён быў выбраны тайным галасаваннем падчас адкрыцця чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання.

Дагэтуль Уладзіслаў Татарыновіч займаў пасаду старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Раней на розных пасадах працаваў у Міністэрстве фінансаў.

Сяргей Хаменка, які дагэтуль з'яўляўся намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі, вызвалены ад пасады па асабістай ініцыятыве. Яго паўнамоцтвы як члена Савета Рэспублікі спынены.

**Вераніка КАНЮТА.**

# БЯСПЕКА ГРАМАДЗЯН І ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ

**Падчас адкрыцця трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання дэпутаты разгледзелі 7 законапраектаў**

Заканадаўчыя рашэнні накіраваны на ўмацаванне бяспекі краіны, яе грамадзян, паглыбленне супрацоўніцтва з нашым стратэгічным партнёрам — Расійскай Федэрацыяй. Спрашчаецца адміністрацыйная працэдура па нормах расходу паліўна-энергетычных рэсурсаў, што знізіць нагрузку на дзяржаўныя органы і забяспечыць роўнасць умоў для юрыдычных асоб розных форм уласнасці. Пад абаронай — і правы фізічных асоб у сферы прадастаўлення пазык. Пра некаторыя з разгледжаных законапраектаў расказваем падрабязней.



Фота БелТА.

## НОВЫЯ ЗАДАЧЫ УЗБРОЕНЫХ СІЛ І ПАЎНАМОЦТВЫ РАТАВАЛЬНІКАЎ

Праектам Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння ваеннай бяспекі і абароны», прынятым у першым чытанні, у прыватнасці, прыводзяцца ў адпаведнасць з Ваеннай дактрынай паўнамоцтвы Прэзідэнта, Савета Бяспекі, Міністэрства абароны і Генеральнага штаба Узброеных Сіл у галіне абароны. Удакладняюцца і канкрэтызуюцца задачы Узброеных Сіл, функцый Генеральнага штаба Узброеных Сіл па забеспячэнні ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны Беларусі. У адпаведнасць з Ваеннай дактрынай прыводзіцца пералік і ваенных пагроз, якія з'яўляюцца падставамі для ўвядзення ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі. Прадугледжана аднясенне акта ўзброенай агрэсіі з боку якой-небудзь дзяржавы (кааліцыі дзяржаў), учыненай супраць Саюзнай дзяржавы, да нападзення, якое з'яўляецца падставай для ўвядзення ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі.

У першым чытанні разгледжаны праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях», якім удакладняюцца паўнамоцтвы Прэзідэнта і Савета Міністраў у галіне гарантавання пажарнай бяспекі. З абласных бюджэтаў і бюджэту горада Мінска выключаецца фінансаванне органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. Яны будуць фінансавацца з рэспубліканскага бюджэту і адносіцца да ваенізаваных арганізацый.

Паўнамоцтвы па ажыццяўленні дзяржаўнага пажарнага нагляду, арганізацыі тушэння пажараў замацоўваюцца на аб'ектах па вытворчасці, захоўванні і ўтылізацыі выбуховых матэрыялаў і вырабаў, якія іх утрымліваюць. Работнікі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях надзяляюцца правам правядзення асабістага дагляду грамадзян і прымянення спецыяльных сродкаў у выпадках і парадку, якія вызначаюцца законапраектам.

## ЗА НЕЗАКОННАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ БЕСПІЛОТНІКАЎ — КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

У другім чытанні дэпутаты адобрылі законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці». Як патлумачыў **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Юрый МАРЭЦКІ**, яго асноўная мэта — імплементацыя Указа Прэзідэнта № 297 «Аб дзяржаўным уліку і эксплуатацыі грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў» у нацыянальную грамадскую бяспеку, выкананне палётаў грамадзянскімі беспілотнымі лятальнымі апаратамі ў паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Уводзіцца адміністрацыйная адказнасць за кіраванне грамадзянскім паветраным суднам, якое не зарэгістравана ў Дзяржаўным рээстры грамадзянскіх паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь, або не мае бартавой дакументацыі, якая павінна знаходзіцца на борце паветранага судна пры выкананні палётаў. Адміністрацыйная адказнасць прадугледжана і за кіраванне грамадзянскім паветраным суднам, калі яно ажыццяўляецца асобай, якая не мае права кіравання ім, а таксама за парушэнне патрабаванняў па дзяржаўным уліку і эксплуатацыі грамадзянскіх БЛА. За паўторнае парушэнне заканадаўства ўстанаўліваецца крымінальная адказнасць.

## ПАЗЫКІ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

На абароны правоў пазычальнікаў — фізічных асоб, зніжэнне пазыковай нагрузкі на такіх грамадзян, выключэнне выпадкаў заключэння з грамадзянамі дагавораў пазыкі на кабальных умовах, а таксама на павышэнне даверу насельніцтва да фінансавага сектара накіраваны нормы законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях прадастаўлення пазык», разгледжаным у другім чытанні.

«Так, прадметам закладу не можа з'яўляцца адзінае жылое памяшканне (жылы дом, кватэра, або частка долі ў сумесным домаўладанні), — канкрэтызаваў **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Аляксей РАЙКО.** — Акрамя таго, устанаўліваецца забарона на прадастаўленне пазык паміж фізічнымі асобамі ў замежнай валюце, за выключэннем блізкіх сваякоў. Забараняецца заключэнне дагавора пазыкі індывідуальнымі прадпрымальнікамі, юрыдычнымі асобамі, якія не маюць права ў якасці асноўнай сваёй дзейнасці займацца пэўнымі фінансавымі аперацыямі».

**Вераніка КАНЮТА.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Белмедстекло»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 20.10.2025.**

**Лот № 1:** SUBARU TRIBECA,
кузов (рама) № 4S4WXFLU58S013330, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 10 320,00 руб.
Задаток – 1 032,00 руб.

**Местонахождение:**
Минская обл., г. Борисов, ул. Толстикова, д. 2Б.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **16.10.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**
УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**РУП «БЕЛСОЮЗПЕЧАТЬ»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения.

**Электронные торги состоятся 08.10.2025.**

**Лот № 1:** грузовой вагон FORD TRANSIT VAN,
кузов (рама) № WF0XXXTTFXDP44042, 2013 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 6 000,00 руб.

**Лот № 2:** грузовой вагон FORD TRANSIT,
кузов (рама) № WF0XXXTTFXAG08571, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 100,00 руб.

**Лот № 3:** грузовой вагон FORD TRANSIT,
кузов (рама) № WF0XXXTTFXAT27818, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 2 400,00 руб.

**Лот № 4:** грузовой вагон FORD TRANSIT VAN,
кузов (рама) № WF0XXXTTFXCS79828, 2012 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 300,00 руб.

**Лот № 5:** грузовой вагон FORD TRANSIT,
кузов (рама) № WF0XXXTTFXAG08594, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 050,00 руб.

Местонахождение Лотов №№ 1–5:
г. Минск, ул. Лукьяновича, 12.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by, au.nca.by) и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**
УНП 190055182

**Открытое акционерное общество**
**«Минсктелекомстрой»**
(сокращенное наименование – ОАО «Минсктелекомстрой»), место государственной регистрации:
Республика Беларусь, 220037, г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, –
**настоящим доводит до сведения своих акционеров информацию о том, что 10 сентября 2025 г. внеочередным общим собранием ОАО «Минсктелекомстрой»**
(протокол от 10 сентября 2025 г. № 42)
**приняты следующие решения по вопросам повестки дня собрания:**

По первому вопросу: Об утверждении договора о присоединении открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой» и открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ» к открытому акционерному обществу «Белсвязьстрой».

Принятое решение:

Утвердить договор о присоединении открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой», открытого акционерного общества «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ» к открытому акционерному обществу «Белсвязьстрой» (приложение 1 к протоколу собрания акционеров).

По второму вопросу: Об утверждении передаточного акта открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой».

Принятое решение:

Утвердить передаточный акт открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой», составленный по состоянию на 1 апреля 2025 г. (приложение 2 к протоколу собрания акционеров).
УНП 100068131

Просим **считать недействительной** квитанцию о приеме наличных денежных средств формы 1СУ серии ВВ № 1549952 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **в связи с ее утерей.**
УНП 100357923

17 верасня ДЗЕНЬ НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

# ГАВАРЫЦЬ. НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта тут, на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая, паводле Рыжскага дагавора, засталася за Польшчай, размяшчаўся адзін з самых суровых канцлагераў Еўропы. Канцлагер «Бяроза-Картузская» быў арганізаваны ў чэрвені 1934 года ўладамі Другой Рэчы Паспалітай як адна з мер палітыкі «санацыі», абвешчанай рэжымам Юзафа Пілсудскага, які прыйшоў да ўлады ў 1926 годзе ў выніку дзяржаўнага перавароту. Каб зрабіць польскую дзяржаву моцнай, трэба было «ачысціць» яе ад усіх тых, хто гэтаму можа перашкаджаць. У дачыненні да нацыянальных меншасцяў гэта выявілася ў палітыцы «культурнага падаўлення». У Бярозе для арганізацыі канцлагера не трэба было нічога ствараць адмыслова: тут з XIX стагоддзя былі вялікія Чырвоныя казармы, пабудаваныя для патрэб царскай арміі з цэглы былога картэзіянскага кляштара. А непадалёк — чыгуначная станцыя, было зручна прывозіць вязняў... 15 чэрвеня 1934 года здарылася нагода, якая абгрунтоўвала дзейнасць канцлагера, а праз два дні сюды прывезлі першых зняволеных.

Цяпер у адным з карпусоў былых Чырвоных казармаў месціцца музейная экспазіцыя «Канцлагер Бяроза-Картузская 1934—1939 гг.». Яна была створана ў сценах колішняга лагера ў 2022 годзе з мэтай захавання гістарычнай памяці пра тыя няпростыя часы, калі Беларусь была падзелена на дзве часткі. Макет лагера, фотаматэрыялы і ўспаміны былых зняволеных дазваляюць зразумець, што гэта было. Дапамагаюць тэхналогіі віртуальнай рэальнасці: праз акуляры бачыш як цяпер карпусы з камерамі вязняў, усю тэрыторыю з вартавымі вышкамі, якая да таго ж была абнесеная калючым дротам. Мясцовыя жыхары імкнуліся далёка абыходзіць гэта месца. Над лагерам заўсёды стаяла мёртвая цішыня...







Менавіта тут сабраліся ўдзельнікі аўтапрабегу, каб пачуць, агучаныя маладымі людзьмі, успаміны былых вязняў канцлагера пра ўмовы ўтрымання і метады «перавыхавання». У лагеры было два правілы: усе загады каменданта трэба было выконваць хутка і моўчкі. Другое: нельга было размаўляць і нават пераглядацца.

Для больш моцнага ўражання варта наведаць гістарычную рэканструкцыю камер з чалавечымі постацямі ў натуральную велічыню. У невялікім пакойчыку агульнай камеры маглі ўтрымлівацца ад 20 да 40 зняволеных. Тут ёсць двух'ярусныя нары з саламянымі матрацамі. А ў адзіночнай камеры (карцары) — наогул ніякіх нар, толькі бетонная падлога, якую час ад часу яшчэ і палівалі вадой. Сем дзён без святла, ежы і фактычна без сну — кожныя дзве гадзіны вязень павінен быў адгукацца на пераклічцы. Траплялі ў канцлагер без суда і следства. А былі героі, якія праходзілі праз карцар неаднойчы, разумеючы ўсе наступствы «адзіночкі» для сябе — ажно да вар'яцтва. Галоўнай задачай было — зламаць людзей псіхалагічна і фізічна, сцерці асобу, якая б назаўсёды адкінула думкі пра любы супраціў. Так дзейнічалі ў дачыненні да найбольш актыўных сялян і працоўных, якія ўздымалі бунты, да культурных і грамадскіх дзеячаў беларускага, украінскага, яўрэйскага народаў і нават нязгодных з існуючай палітыкай палякаў. Паводле афіцыйных даных, пацверджаных польскімі гісторыкамі, праз канцлагер «Бяроза-Картузская» прайшло больш за 3000 чалавек, але сведкі сцвярджалі, што ў картатэку заносілі не ўсіх. Беларускія гісторыкі лічаць, што больш чым за пяць гадоў праз катаванні ў «Бярозе-Картузскай» прайшлі да 10 тысяч беларусаў, рускіх, палякаў, украінцаў.

«Бярозу-Картузскую» называлі «самым спартыўным лагерам у Еўропе» (дагэтуль ужо існаваў фашысцкі «Дахау»). Пакуты і прыніжэнні адміністрацыя лагера лічыла гімнастыкай. Пад'ём а 4-й раніцы, на дзень складалі два спісы: адных накіроўвалі на працу, другіх — заганялі на муштру, падчас якой людзям трэба было бегаць, поўзаць, хадзіць па-качынаму да поўнай знямогі. Практыкаванне «жабкі» маглі выканаць, мабыць, толькі акрабаты. Была «паліцэйская дарожка», па якой трэба было бегчы пад ударамі дубінак і не падаць, бо тады ўдараў станавілася яшчэ больш...

Адным з пакаранняў была «крывавая дарожка». Тых, хто, на думку начальства, у чым-небудзь правініўся, прымушалі на каленях і локцях паўзці па вострых аскепках цэглы. А наперадзе чакаў паліцэйскі з дубінкай. У хуткім часе ўвесь гэты шлях быў адзначаны крывёй...

Па сімвалічнай «крывавай дарожцы» — з агнём у чырвоных лапмадках — прайшлі ўдзельнікі мітынгу-рэквіема да мемарыяльнага знака з абеліскам «Памяці ахвяр польскай акупацыі Заходняй Беларусі 1921—1939 гадоў». Ушанаваць гэта месца вырашылі яшчэ ў 60-я гады, але ў нядаўні час яно перажыло рэканструкцыю. Пры гэтым дарожка да абеліска і ён сам стаіць на так званай «трылінцы», якую выраблялі вязні канцлагера. Цяпер тут нагадалі пра неабходнасць засвоіць як належыць урокі гісторыі, памятаць, праз што прайшлі беларусы ў імкненні мець сваю дзяржаву. І сапраўды, нам ёсць што ўспамінаць у найноўшай гісторыі...

Мемарыяльную зону былога канцлагера «Бяроза-Картузская» напярэдадні Дня народнага адзінства прапанавалі абвясціць усебеларускім месцам памяці. Памяці пра трагедыю і подзвіг беларусаў падчас знаходжання пад польскай акупацыяй. Бо ў Заходняй Беларусі быў магутны рух за захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, права мець сваю веру і мову, быць адзіным народам. Акрамя Бярозы існавалі іншыя вязніцы, дзе ўтрымлівалі тых, хто не быў згодны з палітыкай этнацыду: Гродзенская турма, сумнавядомыя віленскія Лукішкі, Навагрудак, Пінск — пра іх нагадаў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кіраўнік беларускага таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН.** «Для нас «Бяроза-Картузская» павінна быць такім жа месцам памяці, як і тыя мясціны, дзе ажыццяўляўся генацыд у гады Вялікай Айчыннай вайны падчас нямецкай акупацыі, бо гэты канцлагер ствараўся па тых жа «лякалах», — адзначае ён.

Некалькі пакаленняў заходніх беларусаў былі ўцягнутыя ў нацыянальна-вызваленчы рух. Яго сімвалам стала выламаная вязнямі брама канцлагера: калі была вядома пра паход Чырвонай Арміі 17 верасня, яны вырваліся і пайшлі па вуліцах Бярозы. Іх, знясіленых, але рашучых, сустракалі жыхары горада, падносілі хлеб, ваду, якой не хапала, асабліва ў апошнія дні. Не менш жаданымі была свабода і адчуванне таго, што іх ахвяры і пакуты не былі дарэмнымі.



Былі сярод вязняў людзі, што сталі вядомымі, — паэты Максім Танк, Валянцін Таўлай, былі ідэйныя барацьбіты-камуністы і камсамольцы. На мітынгу прагучалі некаторыя імёны: Нестар Андранюк, член ЦК камсамола Заходняй Беларусі з 1928 года; Сцяпан Бурак, член КПЗБ з 1934-га; Лука Валасюк, сакратар Кобрынкага райкама КПЗБ; Мікалай Ганецкі, адзін з кіраўнікоў КПЗБ Віленшчыны, арыштоўваўся 7 разоў; Рыгор Сеткавец, член Пінскага акружнога камітэта КПЗБ; Хведар Маркаў, член КПЗБ з 1934-га, пазней Герой Савецкага Саюза (гэта званне ён атрымаў за гераічны подзвігі ў партызанскім руху падчас Вялікай Айчыннай вайны). Не ўсім удалося выйсці жывымі, пры тым што ў лагеры не было масавых забойстваў, але людзі не вытрымлівалі... Гісторыкі лічаць, што такіх ахвяр магло быць ад некалькіх дзясяткаў да 300 чалавек.

**Старшыня партыі «Белая Русь» Вольга ЧАМАДАНАВА** нагадала прысутным на памятным мерапрыемстве:

— Мы пяты год адзначаем Дзень народнага адзінства (а гэта самае маладое дзяржаўнае свята суверэннай Беларусі), і дагэтуль мы адкрываем новыя старонкі ў гісторыі. І калі мы звяртаемся да таго часу, дакладна ведаем, што ніколі беларусаў не пастаявіць на калені. Мы будзем адстойваць сваю незалежнасць, будзем памятаць герояў вялікай Перамогі. Захоўваючы гістарычную праўду, мы будзем будаваць шчаслівую будучыню нашай краіны.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**




# НЯВЫВУЧАНЫЯ ЎРОКІ ГІСТОРЫІ

**Аб этнацыдзе беларускага народа ў міжваеннай Польшчы заходнія дэмакратыі сарамліва маўчаць**

Сённяшнія польскія палітыкі, якія ўсталі на шлях эскалацыі міжнароднай абстаноўкі ва ўсходнім рэгіёне еўрапейскага кантынента, так і не вывучылі ўрокі Другой сусветнай вайны. Яны вырашылі не ўспамінаць ганебных старонак сваёй гісторыі, звязанай з асіміляцыяй беларускага насельніцтва, прыгнётам элементарных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, тэрытарыяльнымі дамаганнямі на землі суседніх дзяржаў, фліртам з фашысцкай Германіяй. Разам з намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алегам ДЗЯЧЭНКАМ, прафесійным гісторыкам, правядзём экскурс у гісторыю, а між іншым і асвяжым памяць нашым суседзям.



## ЗНІШЧЫЦЬ І РАСТАПТАЦЬ ЯК НАЦЫЮ

— У мінулым стагоддзі па волі геапалітычных гульцоў таго часу значная частка беларускага народа больш чым на 18 гадоў апынулася пад уладай кіраўнікоў Польшчы, якія прытрымліваліся вельмі правых палітычных поглядаў і былі варожа настроены да беларусаў і іншых нацыянальнасцяў, што апынуліся пасля 1921 года па-за сваімі нацыянальнымі дзяржаўнымі ўтварэннямі, — нагадвае суразмоўца.

У той перыяд беспрацоўе, няўпэўненасць у заўтрашнім дні, нястача, нацыянальная няроўнасць, разгул антыкамунізму, паліцэйскага тэрору і судовых рэпрэсій супраць беларускага насельніцтва сталі своеасаблівымі візітнымі карткамі ўнутрыпалітычнага жыцця буржуазна-памешчыцкай Польшчы ў 1920—1930-х гадах.

— Стратэгія і тактыка польскіх улад грунтавалася на пастаянным правакаванні міжнацыянальных сутыкненняў, нацкоўванні адной нацыянальнасці на іншую і заключалася ў імкненні да поўнай асіміляцыі беларусаў, іх дэнацыяналізацыі і змене рэлігійнай ідэнтычнасці. Галоўная ўвага пры гэтым аддавалася знішчэнню беларускай культуры і традыцыйнай духоўнасці, — падкрэслівае парламентарый.

Ён прыводзіць лічбы: да 1939 года па відавочна заніжаных даных былі ліквідаваны ўсе 400 беларускіх школ, знішчаны культурна-асветніцкія арганізацыі, забаронена выданне беларускіх газет, а кожнае незалежнае слова і свабодная думка душыліся неадкладна і бязлітасна. Тым самым сярод белага дня на вачах у сусветнай супольнасці адбывалася абуральнае ўшчамленне канстытуцыйных правоў беларускага народа, такіх як свабода аб'яднанняў, свабода слова і свабода друку:

> **— Беларусы фактычна былі пазбаўлены магчымасці мець свае палітычныя, прафесійныя і культурныя арганізацыі, а аб тым, каб асобам беларускай нацыянальнасці займаць якія-небудзь дзяржаўныя пасады, і гаворкі быць не магло. Пра гэты этнацыд беларускага народа ў міжваеннай Польшчы заходнія дэмакратыі дагэтуль сарамліва маўчаць.**

У пацвярджэнне суразмоўца прывёў два характэрныя прыклады:

— У 1925 годзе была створана Беларуская рабоча-сялянская грамада, якая налічвала каля 150 тысяч чалавек. Гэта была вельмі ўплывовая палітычная сіла, якая змагалася за жыццёвыя правы беларускага народа. Рэакцыя польскіх улад на рост аўтарытэту гэтай палітычнай арганізацыі была вельмі хуткай. Ужо вясной 1927 года грамада была разгромлена, а яе члены рэпрэсіраваны.

## БЯРОЗА-КАРТУЗСКАЯ — ФАБРЫКА ЖАХУ

Гісторык звяртае ўвагу на той факт, што асаблівым дэманстратыўным здзекам падвяргаліся актывісты Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і камсамола:

— Зверскія катаванні прымяняліся ў дачыненні да вядомага камуніста Сяргея Прытыцкага. Садысты ў паліцэйскай форме імкнуліся прынесці як мага больш болю і пакутаў змагару за сацыяльную справядлівасць і грамадзянскія правы простых беларусаў, за аб'яднанне беларускага народа.

Парламентарый канстатуе: апафеозам унутранай палітыкі польскага дыктатара Юзафа Пілсудскага стала стварэнне канцлагера ў Бярозе-Картузскай у 1934 годзе. Вядомы канкрэтныя факты здзекаў са зняволеных канцлагера, да якіх каты ўжывалі фізічны гвалт і псіхалагічныя катаванні. Кроў стыла ў жылах ад пазасудовых карных расправ над беларускімі патрыётамі і звычайнымі грамадзянамі, западозранымі польскай дэфензівай (контрразведкай) у сімпатыях да Савецкай Беларусі. Праз гэтую фабрыку жаху і нечалавечых пакут прайшло да 10 тысяч чалавек. Аб гэтым трагічным перыядзе нашага народа сёння расказвае ўсяму свету музейная экспазіцыя Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.

— Ды і ў дачыненні да шырокіх мас простага насельніцтва польскай паліцыяй пры ўдзеле «асаднікаў» выкарыстоўваліся так званыя акцыі пацыфікацыі, або «супакаення», якія грунтаваліся на грубай сіле і на справе ператвараліся ў сапраўдныя карныя экспедыцыі супраць беларускіх сялян, — адзначае Алег Дзячэнка і прыводзіць прыклад. — Узброеныя атрады пілсудчыкаў здзяйснялі налёты на беларускія хутары і вёскі, трымаючы людзей у пастаянным страху, у цісках бяспраўя і самавольства.

## АПЕТЫТЫ НЕНАСЫТНАЙ «ПАНЕНКІ»

Ратуючыся ад цяжкага эканамічнага і палітычнага прыгнёту, нацыянальнай і рэлігійнай дыскрымінацыі, ад злачыннай дзейнасці польскіх карных органаў у цэлым, беларусы вымушаны былі з'язджаць у краіны Лацінскай Амерыкі, у ЗША і Канаду. Многія з іх з рызыкай для жыцця пераходзілі польска-беларускую граніцу ў пошуках прытулку на савецкай тэрыторыі.

— Злачынны і абыякавы да сапраўдных інтарэсаў беларускага народа санацыйны дыктатарскі рэжым Юзэфа Пілсудскага і яго прыхільнікаў не толькі дапусціў стратэгічныя ўнутрыпалітычныя пралікі і памылкі, але і завёў краіну ў палітычны тупік, выхадам з якога праз усяго некалькі гадоў стала страта ўласнай дзяржаўнасці, — адзначае гісторык. — У студзені 1934 года польскі дыктатар заключыў з фашысцкай Германіяй пакт аб ненападзенні за абяцанне зрабіць Польшчу ўдзельніцай будучай дзяльбы зямель у Еўропе.

Які быў разлік? У выніку змовы з германскім фашызмам палякі разлічвалі займець Савецкую Украіну.






— Сяброўства з немцамі было настолькі трывалым, што на пахаванне Пілсудскага, які памёр у маі 1935 года ад раку печані, з нацысцкай Германіі прыбыў сам Герман Герынг, які з'яўляўся пасля Гітлера другім па ўплыве нацыстам у фашысцкім Рэйху, — праводзіць экскурс у гісторыю Алег Дзячэнка.

У выніку ў кастрычніку 1938 года польскія войскі пры адабрэнні германскіх фашыстаў акупавалі Цешынскую Сілезію, якая належала Чэхаславакіі, а менш чым праз год сама Польшча стала ахвярай нямецкай агрэсіі.

> **— Палітыкі ў сучаснай Польшчы імкнуцца не ўспамінаць ганебных старонак сваёй гісторыі, звязаных з асіміляцыяй беларускага насельніцтва, прыгнётам тагачасным рэакцыйным рэжымам элементарных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, тэрытарыяльнымі дамаганнямі на землі суседніх дзяржаў, фліртам з фашысцкай Германіяй, — звяртае ўвагу намеснік старшыні профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў. — Яны забыліся пра 600 тысяч жыццяў савецкіх воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны за вызваленне Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Няма слоў падзякі і за многае іншае, што набыла Варшава дзякуючы Савецкаму Саюзу ўжо пасля пераможнага мая 1945 года.**

Парламентарый з горыччу адзначае, што сёння Польшчай кіруюць палітыкі, якія, пайшоўшы па шляху эскалацыі міжнароднай абстаноўкі ва ўсходнім рэгіёне еўрапейскага кантынента, так і не вывучылі ўрокі Другой сусветнай вайны:

— Яны зноў гуляюць у «рускую рулетку» з Лонданам, Парыжам і Берлінам, спрабуючы заняць цёпленькае месца ў групоўцы краін, недружалюбных да Беларусі і Саюзнай дзяржавы і, будучы правакатарамі вайны, якія прызвычаіліся заграбаць жар чужымі рукамі, адкрыта заяўляюць аб новых тэрытарыяльных прэтэнзіях і геапалітычных амбіцыях.

На думку суразмоўцы, ні да чаго добрага такая палітыка не прывядзе.

— Пара палякам навучыцца жыць сваім розумам у міры і добрасуседстве з беларусамі, якія заўсёды адкрыты для дружбы і раўнапраўнага дыялогу, узаемавыгаднага палітыка-дыпламатычнага, гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, — рэзюмуе дэпутат.

Фота БелТА.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:**
капитальное строение с инвентарным номером 111/С-7270 (наименование: Фельдшерско-акушерский пункт; назначение: Здание специализированное здравоохранения и (или) предоставления социальных услуг), площадью 60,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, д. Шевели, ул. Центральная, 28, на земельном участке с кадастровым номером 125086206601000020 площадью 0,0570 га, составные части и принадлежности: одна дощатая с облицовкой кирпичом веранда, крыльцо, один шиферный сарай, одна дощатая уборная и металлическое ограждение

| Начальная цена, руб. | 1 базовая величина – 42,00 руб. | Размер задатка, руб. | 1 базовая величина – 42,00 руб. |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Жеребковичи», 225390, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Жеребковичи, тел. 80163345223.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 02 октября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162)-40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 01 октября 2025 г. до 17.00**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка». УНП 191224638. 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «Нео Банк Азия». УНП 807000071. 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20-2 |

**Предмет электронных торгов**

**Жилой дом**
(Здание блокированного жилого дома),
инв. № 600/С-106668, общ. пл. 311,7 кв. м,
по адресу: ***Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Замковая, 4В.***

Составные части и принадлежности: Трехэтажный блочный жилой дом, состоящий из первого, второго и мансардного этажей с подвалом.
***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. 0,2324 га, предоставлен продавцу на праве аренды (по 21.07.2124) для строительства и обслуживания блокированного жилого дома

**Начальная цена – 610 573,88 рублей без НДС**
**Шаг торгов – 5 % от начальной цены**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) на счет BY92BELB3012004835 0080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **20.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |




17 ВЕРАСНЯ ДЗЕНЬ НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

# «У АДЗІНСТВЕ НАРОДА — БУДУЧЫНЯ БЕЛАРУСІ»

## По ўсёй краіне перад Днём народнага адзінства прайшлі дыялогавыя пляцоўкі з удзелам моладзі

У Гродне дыскусійны форум быў арганізаваны з удзелам старшыні Цэнтрвыбаркама Ігара КАРПЕНКІ і студэнтаў і выкладчыкаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

Дыялогавая пляцоўка «У адзінстве народа — будучыня Беларусі» яшчэ раз падкрэсліла значнасць камунікацыі і ўзаемаразумення. Падчас адкрытага абмеркавання ўдзельнікі закранулі ключавыя аспекты развіцця краіны, у тым ліку гістарычны шлях, пераемнасць пакаленняў і ролю моладзі ў фарміраванні будучыні.

Асаблівую ўвагу ўдзялілі стратэгічным задачам развіцця Беларусі. Ігар Карпенка падкрэсліў важнасць стварэння сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. Яна павінна садзейнічаць устойліваму росту, паляпшэнню якасці жыцця грамадзян і інтэграцыі ў сусветную эканоміку. Таксама абмеркавалі знешнюю палітыку, бяспеку, абарону дзяржаўных інтарэсаў і развіццё чалавечага патэнцыялу.

Старшыня ЦВК Беларусі, звяртаючыся да моладзі, падкрэсліў яе важную ролю ў фарміраванні будучыні нашага грамадства. Ён адзначыў, што маладыя людзі, якія ўжо асвоілі школьны курс гісторыі Беларусі і працягваюць паглыбленае вывучэнне гісторыі беларускай дзяржаўнасці, нясуць пэўную адказнасць за стратэгічнае развіццё краіны. Аднак, на яго думку, зносіны з прадстаўнікамі старэйшага пакалення таксама важныя для захавання гістарычнай пераемнасці.

— Моладзь павінна ўсведамляць, што яе поспехі і дасягненні будуюцца на падмурку, закладзеным папярэднімі пакаленнямі, якія ўмацоўвалі суверэнітэт, незалежнасць і дзяржаўнасць Беларусі. Гістарычны шлях краіны быў няпростым, і сёння перад намі стаіць задача захаваць і прымножыць гэту спадчыну, — адзначыў Ігар Карпенка.

Старшыня ЦВК нагадаў пра падзеі пачатку 1990-х гадоў, калі Беларусь набыла незалежнасць. У той перыяд краіна стаяла перад складаным выбарам: які кірунак развіцця абраць. Ігар Карпенка падкрэсліў, што адзінства народа мае на ўвазе ўсведамленне магчымых наступстваў няправільнага стратэгічнага выбару. Паводле яго слоў, выбіраючы лідара, мы вызначаем курс, які ён будзе імкнуцца рэалізаваць. Пытанне аб будучыні Беларусі датычыцца не толькі цяперашняга, але і наступных пакаленняў, якія будуць жыць у краіне, што мы ствараем сёння.



**Студэнтка 1 курса ГрДУ імя Янкі Купалы Мар'я Мацюк** падзялілася ўражаннямі:

— 17 верасня мы святкуем Дзень народнага адзінства. Напярэдадні гэтай падзеі ўніверсітэцкае жыццё напоўнена новымі сустрэчамі і абмеркаваннямі. Нягледзячы на тое, што свята адзначаецца ўсяго некалькі гадоў, яно ўжо набыло маштаб і важнасць, і кожны ўсведамляе яго значнасць.

Пад уражаннем ад сустрэчы застаўся і яшчэ адзін першакурснік. **Іван Музычка** адзначыў, што ён даведаўся шмат новага.

— Дзень народнага адзінства для жыхароў Беларусі — гэта асаблівае свята, бо краіна заўсёды адрознівалася гасціннасцю і прыязнасцю. Моладзь усведамляе важнасць гэтага дня. У Беларусі арганізоўваецца шмат мерапрыемстваў, прысвечаных гэтаму святу. Форум «Беларусь адзіная» і штогадовы форум «17 граняў адзінства» з'яўляюцца яркімі прыкладамі такіх падзей. Гэтыя мерапрыемствы сімвалізуюць незалежнасць і адзінства беларускага народа.

На выбарах 2029 года з'явіцца каля 450 тысяч новых выбаршчыкаў. Да 2030 года іх стане яшчэ на дзясяткі тысяч больш. Гэта пакаленне будзе вызначаць будучыню краіны. Ігар Карпенка лічыць, што для стабільнасці і прагрэсу трэба захоўваць адзінства грамадства і ўзгодненасць мэт. Гістарычна рознагалоссі і ўнутраныя канфлікты выкарыстоўвалі вонкавыя сілы, каб аслабіць краіну. Беларусь, на яго думку, павінна рухацца наперад, абапіраючыся на агульнае бачанне задач, узаемную павагу і прыхільнасць суверэнітэту.

***

**У БДУІР правялі дыялогавую пляцоўку «Грані адзінства». Напярэдадні самага маладога свята ў гісторыі суверэннай Беларусі — Дня народнага адзінства — рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ расказаў студэнтам, што яно значыць для сучаснага грамадства і чаму адзінства народа важна для будучыні нашай краіны.**

— Наш Прэзідэнт справядліва адзначае важнасць 17 верасня. Калі б у 1939 годзе ў гэты дзень не адбылося аб'яднанне Беларусі, гісторыя краіны склалася б зусім інакш. Яе проста магло не быць, — падкрэсліў Вадзім Богуш. — Наўрад ці існавалі б нашы сучасныя граніцы, лёс беларускага народа быў бы пад пытаннем. Да таго ж, пакуль частка нашых тэрыторый знаходзілася пад кантролем Польшчы, прыярытэт там аддаваўся польскай мове і каталіцкай веры, а беларуская ідэнтычнасць сістэмна выцяскалася. Два гады пасля 17 верасня 1939 года дазволілі перабудаваць жыццё, умацаваць дзяржаву і падрыхтавацца да будучых выпрабаванняў, у першую чаргу — нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. Не варта забываць і пра тое, што ўз'ядноўваліся сем'і, якія аказаліся па розныя бакі граніцы.

Сёння беларускае грамадства таксама становіцца ўразлівым перад крызісамі — як знешнімі, так і ўнутранымі: «Цяпер у нас існуе праблема не пошуку інфармацыі, а аналізу інфармацыйных плыняў. А вось там галоўнае — не захлынуцца. Скажам так: калі 30 гадоў таму шукалі басейн, каб можна было паплаваць, то сёння мы з вамі ў акіяне, дзе галоўная задача — не патануць».

Але базавыя прынцыпы адзінства, базавыя падыходы сумеснай работы дазваляюць гэтыя складанасці жыцця паспяхова пераадольваць, даючы практычную аснову для развіцця дзяржавы: «Дзень народнага адзінства вызначае базавыя культурныя і нацыянальныя каштоўнасці нашай краіны. А яны, у сваю чаргу, грунтуюцца на міры і ўзаемапавазе, раўнапраўі ўсіх грамадзян незалежна ад іх узроўню адукацыі, паходжання, рэлігійнай прыналежнасці». Вадзім Богуш адзначыў, што Беларусь заўсёды была сацыяльна арыентаванай дзяржавай. Мір, раўнапраўе, клопат аб сям'і і блізкіх людзях замацаваныя і ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу — у Канстытуцыі. Беларускае грамадства заўсёды будавалася менавіта на гэтых прынцыпах, асабліва важных у сучасных рэаліях.

«Нават першы радок нашага гімна гучыць так: «Мы, беларусы, — мірныя людзі». Міралюбівая палітыка для нас прынцыпова важная. Беларусь не ўдзельнічае ў ваенных канфліктах, а, наадварот, становіцца пляцоўкай для іх мірнага ўрэгулявання», — падкрэсліў рэктар БДУІР і адзначыў: адным з важных інтэграцыйных праектаў з'яўляецца праект Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. «У нас, па сутнасці, агульны рынак працы, энергарэсурсаў, высокі ўзровень карэляцыі сістэм адукацыі. Але пры гэтым мы дзве суверэнныя дзяржавы».

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**Аміна НАЗАРАВА**



НАС ЯДНАЕ ПАМЯЦЬ

# ЯНЫ ПАВІННЫ БЫЛІ ЖЫЦЬ

## У «Трасцянцы» адкрылі памятны знак, прысвечаны ахвярам генацыду

Раней падобныя мемарыялы з'явіліся ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, а 16 верасня, напярэдадні Дня народнага адзінства, памятны знак адкрылі ў сталіцы, на тэрыторыі былога лагера смерці. Гэта сімвалізуе адно: наша краіна не толькі памятае, але і робіць усё для таго, каб трагедыя мінулага больш ніколі не паўтарылася.



Фота БелТА.

Міністэрства культуры пры падтрымцы Генеральнай пракуратуры правяло рэспубліканскі конкурс на стварэнне помніка, які б сімвалізаваў генацыд беларускага народа. Перамог тандэм скульптара Івана Казака і архітэктара Віктара Рыбакова з памятным знакам «Дрэва жыцця». Кампазіцыя адлюстроўвае рукі, якія цягнуцца з зямлі.

**Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** на адкрыцці памятнага знака падкрэсліў, што кожны чалавек мае права на жыццё. «Ворагі, якія прыйшлі, паставілі перад сабой мэту знішчыць беларускі народ проста за тое, што ён ёсць, каб не засталося памяці. Людзі тут не шукалі чужой зямлі, гадавалі дзяцей, будавалі планы на жыццё, марылі пра будучыню. Усё гэта раптоўна было перакрэслена. На гэтым месцы загінулі людзі, якія павінны былі жыць. Памяць пра іх назаўжды застанецца ў нашых сэрцах», — са шкадаваннем падсумаваў ён.

Да адкрыцця помніка таксама далучыўся **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.** Ён узнёс малітву аб ахвярах генацыду і асвяціў знак. «Сёння на гэтым месцы цішыня і мір. Разам з тым узнікаюць перажыванні пра тое, як тут магло мець месца такое вялікае злачынства супраць чалавечнасці. Людзі, якія ўнутры душы сваёй пераступалі праз духоўны закон, пакладзены Тварцом, імкнуліся ўзвысіцца над іншымі краінамі, народамі, заняволіць іх, — звярнуўся мітрапаліт да прысутных. — Напярэдадні Дня народнага адзінства мы адкрываем памятны знак. Няхай наша памяць злучаецца з малітвай аб памерлых і заахвочвае да таго, каб захоўваць мірнае неба над нашай зямлёй, дапамагаць адзін аднаму».

Як адзначыў **намеснік генеральнага пракурора Аляксей СТУК,** згодна з заканадаўствам Беларусі, магчыма выносіць прыгаворы ў дачыненні да карнікаў, якія даўно памерлі, а некалькі спраў ужо было разгледжана Вярхоўным Судом, вынесены прыгаворы. «Гэта робіцца не дзеля таго, каб варушыць мінулае. Мы павінны даць прававую ацэнку карнікам, якія здзекаваліся з нашага народа. Парадокс: у некаторых краінах гэтым нацыстам ставяць помнікі, яны славяцца як змагары за нацыянальна-вызваленчы рух. А мы ставім помнікі іх ахвярам», — падкрэсліў намеснік генеральнага пракурора.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

НА СЛЫХУ

# СВЯТА ЗАВІТАЛА Ў ЦЭХ

## Канцэрты, забаўляльныя праграмы, цёплыя сустрэчы — Магілёў з размахам адзначае Дзень народнага адзінства

Гэта свята, па сваёй сутнасці, душэўнае, лічы, сямейнае, таму ў Магілёве яго пачалі адзначаць масава і за некалькі дзён да пачатку. У панядзелак і аўторак на вядучых прадпрыемствах Магілёва адбыліся «цэхавыя» канцэрты пад сімвалічнай назвай «Мы адзіныя!».

Пачатак «цэхавым» канцэртам паклаў знакаміты «Марафон адзінства», які летась трыумфальна прайшоў па гарадах Беларусі. У Магілёве гэты вопыт ўзялі на ўзбраенне і актыўна яго распаўсюджваюць. Як паведаміла **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Булачна-кандытарская кампанія «Дамачай» Вера БАГАЙЧУК,** прадпрыемства нават нагадала арганізатарам, што тут чакаюць артыстаў. Мінулым разам, калі праходзіў падобны канцэрт, людзі былі ў захапленні ад атрыманых уражанняў.

Мерапрыемства адбылося на пляцоўцы чацвёртай вытворчасці, там, дзе пякуць хлеб. На канцэрт прыйшлі людзі розных спецыяльнасцяў... Праграму ад артыстаў Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў № 5 яны ўспрынялі на «ўра». Апладзіравалі, падпявалі і нават прытанцоўвалі. Калі артысты прапанавалі напець беларускую песню «Цячэ вада ў ярок», кожны з прысутных успомніў знаёмы з дзяцінства шлягер. Работнікі былі зачараваныя голасам салісткі Наталлі, якая спявала з душой і натхненнем. А на жаночую палову зрабіў уражанні баяніст, які па-заліхвацку іграў на народным інструменце.




Артысты не толькі спявалі і танцавалі, але і распытвалі работнікаў пра сямейныя традыцыі, захапленні. Засталося шмат прыемных уражанняў ад сустрэчы і адчуванне таго, што ўсіх нас яднае нешта агульнае.

— З датай 17 верасня звязана вялікая падзея, дзякуючы якой захавалася цэласнасць нашай тэрыторыі, — адзначае Вера Багайчук. — Для кожнага магіляўчаніна гэты дзень важны, дапамагае адчуць адзінства ў неспакойным свеце, дзе грымяць войны і адбываецца супрацьстаянне. Мы ж мірна жывём на сваёй зямлі, пішам сваю гісторыю. Нам ёсць што цаніць і берагчы. Над нашымі галовамі не лятаюць беспілотнікі, мы ўпэўненыя ў заўтрашнім дні, гадуем дзяцей і працуем.

На філіяле ААТ «БЕЛАЗ» спявалі артысты Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў № 2. Прыемная падзея адбылася ў малярным цэху, дзе набываюць афарбоўку дэталі магутных беларускіх грузавікоў.

— Вопыт правядзення падобных канцэртаў у нас ёсць, — расказала **намеснік дырэктара па кадрах, ідэалагічнай рабоце і сацыяльным развіцці Святлана КОТАВА.** — І людзі чакалі мерапрыемства з цікавасцю. Нават фізічна адчувалася, як дух свята лунаў у паветры.

Цёпла і з настроем сустракалі артыстаў Магілёўскага гарадскога Дома культуры і вольнага часу «Прыдняпроўскія сяброўкі» на ААТ «Чырвоны металіст». Прымалі іх на тэрыторыі цэха вырабаў з нержавеючай сталі.

— Наша прадпрыемства невялікае, мы далі магчымасць далучыцца да свята як мага большай колькасці нашых рабочых. На канцэрт прыйшлі штампоўшчыкі, шліфоўшчыкі, слесары механазборачных работ, прадстаўнікі іншых працоўных спецыяльнасцяў. Усе атрымалі шмат станоўчых эмоцый, — паведаміў **намеснік дырэктара ААТ па кадрах і прававой рабоце Аляксей КЕШЫШАЎ.**

— Святочныя канцэрты да Дня народнага адзінства для работнікаў прадпрыемстваў на іх працоўных месцах ужо традыцыя, — кажа **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Магілёва Аксана ШЭЙДА.** — Выдатная музыка і артысты, добры настрой у такое знамянальнае свята для кожнага беларуса. Далучыўшыся да святкавання, кожны з нас адчувае сілу адзінства! Разам мы непераможныя!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва філіяла ААТ «БЕЛАЗ».**


## ИЗВЕЩЕНИЕ о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «ГродноАТЭП» в г. Лида 14 октября 2025 года

**Лот № 1**

**Комплекс капитальных строений (зданий, сооружений), расположенный по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Калинина, д. 45**

**Капитальное строение с инв. № 420/С-4164** (здание административно-хозяйственное) площадью 165,4 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-45379** (ул. Калинина, д. 45 корп. 1) (здание диспетчерской) площадью 92,6 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-44466** (ул. Калинина, д. 45, корп. 7) (здание заправочной) площадью 20,1 кв. м; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-44469** (ул. Калинина, д. 45, корп. 5) (здание калориферной) площадью 12,4 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 420/С-4168** (здание гаража № 2) площадью 1141,5 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-4163** (здание хозяйственного склада) площадью 345,3 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-4165** (здание агрегатное, топливное отделение, электроцех, котельная) площадью 641,7 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-47232** (ул. Калинина, д. 45, корп. 6) (насосная) площадью 18,6 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-4166** (здание трансформаторной подстанции) площадью 19,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 420/С-47234** (благоустройство) общей площадью 12 628 кв. м; с составными частями и принадлежностями; существует обременение договорами аренды. **Капитальное строение с инв. № 420/С-46844** (водопроводная сеть), протяжённость 128,3 м; с составными частями и принадлежностями. **Капитальное строение с инв. № 420/С-46843** (канализационная сеть) протяжённость 121,59 м; с составными частями и принадлежностями. **Капитальное строение с инв. № 420/С-50292** (крановая эстакада) общей площадью застройки 879,76 кв. м, железобетон; с составными частями и принадлежностями. **Электрическая сеть** протяжённостью 300 м существует обременение договорами аренды. **Оборудование:** шкаф силовой 2 шт.; емкость 10 куб. м; емкость 29 куб. м; емкость 10 куб. м; котел отопительный КТ-50 2 шт.; пожарная сигнализация; счетчик электрической энергии СЕ 318 BY R32 146.JA.UVFL. **Зелёные насаждения.**
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 423650100013001252 площадью 1,8513 га (имущественное право земельного участка на момент продажи – право постоянного пользования). В соответствии с генеральным планом г. Лида, земельный участок размещается в производственной зоне (территории, предназначенные для размещения промышленных предприятий, транспортной и инженерной инфраструктуры

**НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ: 911 905,92 РУБЛЕЙ (С УЧЕТОМ НДС 20 %)**
Сумма задатка: 91 190,00 рублей

Продавец: **ОАО «ГродноАТЭП»**
**г. Гродно, ул. Суворова, 109, тел. 8 (029) 780-44-30**

Организатор аукциона:
**Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 8 (152) 62-60-55, 62-60-56**

Дата и время проведения аукциона: **14 октября 2025 года, 12.00**

Место проведения аукциона:
**г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал**

Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов:
**г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117**

Дата и время начала приема документов:
**19 сентября 2025 года 08.00;**
дата и время окончания приема документов:
**8 октября 2025 года 17.00**

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона 5 %.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»;
**юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица** – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.
Срок заключения договора купли-продажи – в течение 20 дней после проведения торгов. Оплата вносится в течении 30 календарных дней с даты заключения договора.
• Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона).
• Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) возмещает затраты по оказанию услуг по независимой оценке в размере 4 912,34 руб.
• Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, а также выплатить организатору аукциона вознаграждение в размере 1 %.
Извещение опубликовано на сайтах: Государственного комитета по имуществу **au.nca.by,** Гродненского городского исполнительного комитета **grodno.gov.by,** коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» **gcn.by**

# «НАШ СВЯШЧЭННЫ АБАВЯЗАК — ПАДАЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ СВАІМ БРАТАМ»

## Што пісала «Звязда» аб падзеях 17 верасня 1939 года?


ЗВЯЗДА
Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі
ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б
СОВЕЦКІ ЎРАД АДДАЎ РАСПАРАДЖЭННЕ ГАЛОЎНАМУ КАМАНДВАННЮ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ДАЦЬ ЗАГАД ВОЙСКАМ ПЕРАЙСЦІ ГРАНІЦУ І ЎЗЯЦЬ ПАД СВАЮ АБАРОНУ ЖЫЦЦЁ І МАЁМАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
НАШ СВЯШЧЭННЫ АБАВЯЗАК ПАДАЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ СВАІМ БРАТАМ—БЕЛАРУСАМ І УКРАІНЦАМ, НАСЯЛЯЮЧЫМ ПОЛЬШЧУ, ВЫЗВАЛІЦЬ ІХ АД ПАНСКАГА СВАВОЛЛЯ, НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПРЫГНЕЧАННЯ І ЭКСПЛААТАЦЫІ.

**У той дзень, калі пачаўся вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, найстарэйшае перыядычнае выданне нашай краіны асвятляла шараговыя для таго часу падзеі. У нумары за 17 верасня 1939 года, які выйшаў у нядзелю, журналісты пісалі пра ўздым жывёлагадоўлі ў калгасах, новае папаўненне Чырвонай Арміі, адкрыццё помніка Леніну ў Ерэване, аналізаваўся савецкі і замежны друк, асвятлялася іншая праблематыка. Аб найважнейшай падзеі, якая потым увойдзе ў гісторыю як уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, «Звязда» паведаміць у панядзелак, 18 верасня 1939 года. На працягу пэўнага часу гэта тэма будзе ключавой як у найстарэйшай беларускай газеце, так і ў цэлым у саюзнай перыёдыцы.**

Найбольш грунтоўная падшыўка «Звязды», у тым ліку вераснёўскія нумары 1939 года, захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы. Супрацоўнікі ўстановы беражліва ставяцца да багатага фонду перыядычных выданняў. На момант звароту журналіста ў бібліятэку падшыўка газеты з патрэбным выпускам знаходзілася на рэстаўрацыі. Аднак уся бібліятэчная перыёдыка пераведзена ў «лічбу», таму знаёмства з публікацыямі адбылося ў электронным выглядзе.

### «ГАТОВЫ Ў ЛЮБУЮ МІНУТУ СТАЦЬ НА АБАРОНУ ЛЮБІМАЙ РАДЗІМЫ»

Выпуск «Звязды» за 18 верасня 1939 года пачынаецца са слоў (тагачасная арфаграфія захоўваецца): *«Савецкі ўрад аддаў распараджэнне галоўнаму камандванню Чырвонай Арміі даць загад войскам перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Наш свяшчэнны абавязак падаць руку дапамогі сваім братам — беларусам і ўкраінцам, насяляючым Польшчу, вызваліць іх ад панскага сваволля, нацыянальнага прыгнечання і эксплаатацыі».*

**«Ніякія межы, ніякія пагранічныя слупы больш не падзеляць, не пасякуць на часці нашу родную зямельку-Беларусь»** — пад такім загалоўкам змешчана прамова старшыні Савета народных камісараў СССР Вячаслава Молатава, у якой ён характарызуе становішча Польшчы ў выніку нападзення на яе германскіх войскаў, а адпаведна беларусаў, што насялялі тэрыторыю, дзе пачалася Другая сусветная вайна. Праінфармаваўшы загадзя Польшчу, па распараджэнні савецкага ўрада 17 верасня 1939 года войскі Чырвонай Арміі перайшлі граніцу і занялі тэрыторыю як Заходняй Беларусі, так і Заходняй Украіны. Так пачаўся вызваленчы паход Чырвонай Арміі, мэтай якога была абарона беларускага і ўкраінскага насельніцтва на польскай тэрыторыі ва ўмовах нападзення Германіі на гэту краіну.

Вызваленчы паход, які завяршыўся 25 верасня 1939 года, азнаменаваў аднаўленне гістарычнай справядлівасці, што заключалася ва ўз'яднанні беларускіх земляў у складзе Савецкага Саюза, якія былі захоплены Польшчай у ходзе савецка-польскай вайны 1919—1921 гадоў.

Друкуецца ў гэтым нумары і нота ўрада СССР, уручаная польскаму паслу ў Маскве раніцай 17 верасня. *«Савецкі ўрад не можа таксама абыякава адносіцца к таму, каб аднакроўныя ўкраінцы і беларусы, якія пражываюць на тэрыторыі Польшчы, кінутыя на волю лёсу, заставаліся безабароннымі».* Аб сваіх планах савецкая краіна праінфармавала і дзяржавы, якія мелі дыпламатычныя адносіны з СССР.

У аператыўнай зводцы Генеральнага штаба Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, змешчанай у гэтым нумары, расказваецца, як адносіліся да вызваліцеляў мясцовыя жыхары. *«У калгасным сяле Шустаўцы адбыўся мітынг, на якім прысутнічала 300 калгаснікаў,* — гаворыцца ў публікацыі «Радасны дзень у пагранічным сяле». — *У сваёй рэзалюцыі ўдзельнікі мітынга аднадушна адобрылі рашэнне савецкага ўрада аб дапамозе беларусам і ўкраінцам, насяляючым Польшчу, і заявілі, што яны гатовы ў любую мінуту стаць на абарону любімай радзімы. Як перадаюць відавочцы, брацкую дапамогу савецкага народа, яго доблесных воінаў сардэчна сустракалі сяляне сяла Залесцы Заходняй Украіны. Сяляне дапамагаюць чырвоным часцям прасоўвацца па незнаёмых дарогах».*


РАДАСЦЮ, ШЧАСЦЕМ І БАГАЦЦЕМ
МЫ ПЕРАМОЖАМ
МЫ НЯСЕМ ІМ РАДАСЦЬ І ШЧАСЦЕ

### «САВЕЦКІ САЮЗ ЁСЦЬ АПЛОТ МІРУ»

Другая паласа нумара за 18 верасня адкрываецца ўрачыстым загалоўкам — **«Радасцю, шчасцем і багаццем напоўнена Савецкая Беларусь».**

Рабочыя, інжынеры, тэхнікі і служачыя завода імя Варашылава праз газету заяўляюць аб сваёй гатоўнасці дапамагчы чырвонаармейцам у іх вызваленчай місіі: *«У любы момант мы гатовы па-баявому ўсе, як адзін, рашуча выступіць на абарону нашай сацыялістычнай радзімы і дапамагчы працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і працоўным Польшчы вызваліцца ад іга эксплаатацыі і прыгнечання».*

Многія працоўныя калектывы адрэагавалі на падзею. *«Мы яшчэ раз паказваем на справе ўсяму свету, што Савецкі Саюз ёсць аплот міру, што Савецкаму Саюзу чужда палітыка захватаў, насілля і прыгнечання, што вызваленчы рух прыгнечаных народаў заўсёды знойдзе гарачы водгук, сімпатыю і падтрыманне ўсяго савецкага народа»,* — з рэзалюцыі рабочых і служачых завода імя Дзімітрава.

Заяву Вячаслава Молатава аб рашэнні савецкага ўрада аказаць брацкую дапамогу працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў вызваленні ад прыгнёту польскіх паноў віталі і калгаснікі па ўсёй рэспубліцы, якія выказалі гатоўнасць у любую хвіліну стаць на абарону радзімы і аказаць дапамогу братам-заходнікам.


ПОЛЬСКІЯ ПАНЫ—ВЕКАВЕЧНЫЯ ВОРАГІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Не засталіся ўбаку ад значнай падзеі і беларускія пісьменнікі. У гэтым нумары «Звязды» апублікаваны верш Петруся Броўкі «Заходнім беларусам». Прыводзім некалькі радкоў:

*Палілі вас агнём, знішчалі вас мячом,*
*Не смелі гаварыць вы моваю сваёй,*
*Вы плакалі крывёй пад панскім бізуном,*
*За вас хварэлі мы і сэрцам, і душой.*
*Даволі слухаць больш пакутны спеў бароў,*
*За волю вы пайшлі, для любых ніў і сёл...*
*І беламу арлу, што падае на дол, —*
*Ніколі не ўзняць драпежных кіпцюроў!*

Аб жыцці беларускага народа пры панах з газетных старонках нагадаў пісьменнік Змітрок Бядуля: *«Панскія жандармы, нібы раз'юшаныя псы, учынялі ў мірны час налёты на беларускія і ўкраінскія сёлы, не менш страшныя і дзікія, чым напады ворага ў часе вайны. Беларускія і ўкраінскія мястэчкі і гарады доўгі час стагналі пад несупынным гнётам белапанскай Польшчы. Былі задушаны жыццё, культура, родная мова і ганьбавалася дастойнасць чалавека, нібы ў жудасныя годы сярэдневякоўя. Беспрасветная цемра атрутным туманам вісела над краем».*

### «БУДУ БІЦЦА, НЕ ШКАДУЮЧЫ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ»

Трэцяя паласа гэтага святочнага нумара аб'ядноўвае матэрыялы загалоўкам **«Дапаможам нашым братам вызваліцца з-пад ярма польскіх паноў».**

Тут расказваецца і пра зверскія здзекі з боку палякаў над беларускім і ўкраінскім народам на тэрыторыі Польшчы. Пра паліцэйскія банды і дружыны асаднікаў, якія выграбалі ў сялян усё да апошняга зярнятка, пакідаючы нават дзяцей без ежы. Пра збіццё людзей, якія спрабавалі стаць на абарону ўласнай маёмасці. Пра павелічэнне вязняў канцэнтрацыйнага лагера ў Бярозе-Картузскай нязгоднымі з польскай уладай. У адказ на здзекі сяляне шэрагу населеных пунктаў самасудам расправіліся з паліцэйскімі і памешчыкамі. Такіх фактаў, якія сведчылі аб тым, што цярпенне беларускага селяніна скончылася, было нямала.

Расказваецца і пра становішча працоўных у Польшчы. Заняпад — ва ўсіх галінах прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы. Эксплуатацыя рабочых і рост колькасці беспрацоўных. Павелічэнне працоўнага дня і зніжэнне заробкаў. *«Сучасная Польшча па сваёй галечы пакінула далёка ззаду нават галодную вёску царскай Расіі,* — піша карэспандэнт Г. Цімохаў. — *У вёсках Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пануюць голад і страшэннае жабрацтва».*

*«Рабочы і селянін рашуча пратастуюць супраць вайны, якая вядзецца ў інтарэсах польскіх памешчыкаў і капіталістаў,* — гаворыцца ў публікацыі «Зверскія здзекі над народамі Заходняй Беларусі». — *Яны рэвалюцыйным шляхам дабіваюцца таго свабоднага і раднаснага жыцця, аб якім яны марылі дваццаць год, знемагаючы пад ярмом польскіх памешчыкаў і капіталістаў, звяртаючы свае змучаныя позіркі ў бок СССР — бацькаўшчыны працоўных усяго свету».*

Беларускі народ быў адзіны ў імкненні абараніць сваіх суайчыннікаў, якія апынуліся ў няпростым становішчы. *«Я вельмі добра разумею свой інтэрнацыянальны абавязак воіна РСЧА,* — звяртаецца да чытачоў «Звязды» чырвонаармеец С. Альжанаў. — *І зараз, калі працоўныя Заходняй Беларусі чакаюць ад нас брацкай дапамогі, каб вызваліцца ад польскіх паноў-прыхлыльнікаў, я з радасцю, разам з усімі сваімі баявымі таварышамі, іду на барацьбу з ворагам. Буду біцца, не шкадуючы свайго жыцця».*

Паводле газетных публікацый, дапамогу братам-беларусам у той няпросты перыяд гатовы былі аказаць усе. З гэтай нагоды ў газеце змешчаны звароты калектыву работнікаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, калектыву картаграфічнай фабрыкі № 3, мастакі і работнікі камбіната выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі, студэнты, навуковыя і адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР чакалі ўсе беларусы, для якіх вызваленчы паход Чырвонай Арміі азначаў аднаўленне гістарычнай справядлівасці.

Вераніка КАНЮТА.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
17 верасня 2025 г. № 34 (815)



З НАГОДЫ

# ПРЫГАЖЭЮЦЬ І ЗЗЯЮЦЬ НОВЫМІ ФАРБАМІ

## Як змяняецца аблічча невялікіх населенных пунктаў пры падрыхтоўцы раённых «Дажынак»

Адзначаць раённыя «Дажынкі» ў невялікіх аграгарадках і вёсках стала ўжо добрай традыцыяй. Свята хлебаробаў — гэта не толькі пра народныя гулянні і прызнанне перадавікоў, але і пра магчымасць кардынальна змяніць аблічча сваіх населеных пунктаў. Пры падрыхтоўцы да раённых «Дажынак» аграгарадкі добраўпарадкоўваюцца. У іх рамантуюць дарогі, фасады дамоў, добраўпарадкоўваюць грамадскія месцы, такія як азёры і паркі, ствараюць святочную атмасферу з дапамогай дэкаратыўных элементаў і многае іншае.



### ДАРОЖНЫЯ ПАД'ЕЗДЫ, ГУЛЬНЯВЫЯ ПЛЯЦОЎКІ І СТАНЦЫЯ АБЕЗЖАЛЕЗВАННЯ

Свята на Шклоўшчыне Магілёўскай вобласці сустракаюць на ўздыме. Сёлета раён намалаціў больш за 130 тысяч тон збожжа пры ўраджайнасці 52,2 ц/га, істотна перакрыўшы леташні вынік. У вобласці на ўчарашні дзень ён займаў па вале ганаровае другое месца, саступіў крыху Магілёўскаму, а па ўраджайнасці роўных яму пакуль няма. І важкі ўнёсак у раённы каравай зрабіла ЗАТ «Вялікія Славені», цэнтральная сядзіба якой знаходзіцца ў аднайменным аграгарадку. Нездарма тут і разгорнуцца асноўныя раённыя мерапрыемствы, прысвечаныя галоўнаму святу аграрыяў.

Яно адбудзецца ў кастрычніку, але аграгарадок ужо амаль цалкам падрыхтаваўся да мерапрыемства. Пасвяжэлі фасады дамоў, папрыгажэлі вуліцы, утульны парк і цэнтральная плошча, дзе пройдзе свята. У ходзе падрыхтоўкі перакладзена тратуарная плітка, устаноўлены малыя архітэктурныя формы, змадэрнізавана сцэна, з якой будуць віншаваць і ўзнагароджваць працаўнікоў. На плошчы з'явілася мясцовая славутасць — Дошка гонару з імёнамі людзей, якія зрабілі істотны ўнёсак у развіццё сваёй малой радзімы і ў цэлым сельсавета. У падарунак ад раёна аграгарадок атрымаў дзіцячую гульнявую пляцоўку.

«Гэта ўжо традыцыя — устанаўліваць падобныя пляцоўкі там, дзе праходзяць раённыя «Дажынкі», — кажа **старшыня Славенскага сельсавета Уладзімір МІШЫН.** — Дзеці ў захапленні ад падарунка. Гульнявое абсталяванне ўстаноўлена непадалёк ад цэнтра Малых Славеняў, у двары некалькіх шматкватэрных жылых дамоў, дзе жывуць у асноўным маладыя сем'і».

Плошча таксама стала больш сучаснай і ўтульнай. Устаноўлены паўкруглыя лаўкі, якія набытыя за кошт сродкаў раённага суботніка. У цэлым Славені сталі больш камфортныя для жыцця. Добраўпарадкаваныя дарожныя пад'езды да мясцовай амбулаторыі, прыводзіцца ў парадак дарога па вуліцы Юбілейнай. Зроблены касметычны рамонт будынка, дзе знаходзяцца сельсавет, адміністрацыя гаспадаркі ЗАТ «Вялікія Славені», пошта і іншыя стратэгічныя для населенага пункта службы. Свае аб'екты адрамантавала і раённае таварыства спажывецкай кааперацыі. Населены пункт папрыгажэў і заззяў святочнымі фарбамі.

У аграгарадку пражывае больш як 650 жыхароў. Да нядаўняга часу была праблема з водазабеспячэннем населенага пункта. Сёлета тут будуецца станцыя абезжалезвання. «На ўсю магутнасць вядуцца работы па пракладцы новых камунікацый, — расказвае дэпутат. — Нарэшце праблема будзе вырашана. Аграгарадок цяпер не будзе залежаць ад аграгаспадаркі, якая раней займалася яго водазабеспячэннем».

Жыхары любяць сваю малую радзіму і імкнуцца зрабіць яе яшчэ больш прыгожай — наводзяць парадак каля сваіх домаўладанняў, удзельнічаюць у суботніках. У парку, напрыклад, дапамагалі фарбаваць агароджу. «Сёлета мы яго цалкам пачысцілі, быў вельмі зарослы, — удакладняе суразмоўца. — Да свята трэба, каб паўсюль было прыгожа. У нас яго вельмі чакаюць».

### РАДАВАЦЬ ВЯСКОЎЦАЎ І САДЗЕЙНІЧАЦЬ РАЗВІЦЦЮ ІНФРАСТРУКТУРЫ

У Бераставіцкім раёне на Гродзеншчыне таксама падтрымліваецца маладая традыцыя — праводзіць раённыя «Дажынкі» ў розных аграгарадках. Гэта дазваляе не засяроджваць усё жыццё ў адміністрацыйным цэнтры рэгіёна. Акрамя таго, такая практыка дазваляе размеркаваць намаганні па паляпшэнні ўмоў жыцця для людзей. Вядома, работы па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку вядуцца на рэгулярнай аснове, незалежна ад «Дажынак». Але ў рамках падрыхтоўкі да свята ўдаецца аб'яднаць больш намаганняў і правесці ўсю работу больш цэнтралізавана.

Да «Дажынак» у аграгарадку Малая Бераставіца старанна рыхтаваліся, і вынікам сталі заўважныя змены ў яго абліччы. Сродкі, укладзеныя ў добраўпарадкаванне, накіраваны на павышэнне камфорту мясцовых жыхароў. Новыя аб'екты будуць радаваць вяскоўцаў і садзейнічаць развіццю інфраструктуры. Гэта асабліва важна ў Год добраўпарадкавання. Значную частку работы па рэалізацыі гэтага маштабнага праекту ўзяў на сябе «Малабераставіцкі элітгас». Дарэчы, змяняцца Малая Бераставіца пачала яшчэ ў 2022 годзе. Да 70-годдзя КСУП «Малабераставіцкі элітгас» заклалі парк, які стаў адпраўным пунктам для далейшых змяненняў. Сёння гэту тэрыторыю ледзь можна пазнаць: яна змянілася кардынальна.

Асабліва заўважная работа, праведзеная на набярэжнай ракі Шэпты. На гэтым месцы ўладкавалі паркавую зону з дзіцячай пляцоўкай. Раней тут была пустка, схаваная дрэвамі, і балоцістая мясцовасць, стаяў закінуты дом. Усю тэрыторыю расчысцілі і спланавалі. Прывезлі каля 10 тысяч тон грунту і 2 тысяч тон камянёў. У выніку з'явілася прыгожая дарожка з мостам цераз раку. Цяпер тут зручныя сцяжынкі, прыгожы мост. Побач дзіцячая пляцоўка, дзе ўстанавілі гульнявую зону ў выглядзе карабля.

Таксама добраўпарадкавана тэрыторыя каля былога навучальна-вытворчага камбіната, дзе цяпер ёсць дарожкі і альтанка. Гэта месца зручнае для мясцовых жыхароў і турыстаў, якія спыняюцца, каб зрабіць фота царквы ці касцёла. Створана аўтамабільная стаянка каля школы, якая вырашыла праблему бяспекі на ажыўленай трасе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота Веранікі КАЗЛОЎСКАЙ**
**і з архіва Уладзіміра МІШЫНА.**


# ИЗМЕНЕНИЯ (ДОПОЛНЕНИЯ) К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

*от 09.07.2024 № 52 (3936), с учетом изменений (дополнений) от 08.10.2024 № 78 (3962), от 29.10.2024 № 84 (3968), от 15.11.2024 № 88 (3972), от 15.04.2025 № 29 (4014), от 13.05.2025 № 35 (4020), от 15.07.2025 № 52 (4037), опубликованных в издании газеты «Минский курьер»,*

**по объекту строительства «Многоквартирный жилой дом в границах ул. Восточная, пер. 2-й Топографический, ул. Топографическая в г. Минске»**

**Информация о застройщике**

**Застройщик:** государственное предприятие «УКС Советского района г. Минска» (далее – предприятие) зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 17.12.2014 № 190576654.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 46 а, каб. 1-8. тел/факс +375 17 263-79-77.

**Отдел реализации:** 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 46, каб. 2. тел. +375 17 263-84-36, +375 29 658-00-21, +375 33 392-00-21.

**Режим работы предприятия:** понедельник – четверг с 8.30 до 17.15, пятница с 8.30 до 16.00, обеденный перерыв: с 12.30 до 13.00.

**На дату опубликования настоящих изменений (дополнений) к проектной декларации:**

для категории граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи направлений администрациями районов г. Минска для заключения договоров создания объекта долевого строительства (далее – договор), дополнительно предлагаются 8 (восемь) жилых помещений:

| Тип квартиры | № квартиры | Площадь, кв. м | Этаж | Стоимость 1 м², бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1-комнатная | 37 | 60,24 | 4 | 3 777,39 |
| | 57 | 60,24 | 9 | |
| | 58 | 47,88 | 9 | |
| | 61 | 60,24 | 10 | |
| | 62 | 47,88 | 10 | |
| | 75 | 55,82 | 5 | |
| | 87 | 55,82 | 9 | |
| | 90 | 55,82 | 10 | |

**Условие оплаты:** единовременное внесение денежных средств в течение 10 банковских дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе.

Заявления на участие в долевом строительстве жилых помещений, указанных в настоящих изменениях (дополнениях) к проектной декларации, будут принимать и регистрировать в ходе личного приема и в порядке общей очереди **с 8 часов 30 минут с 23.09.2025 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 46, каб. 1,** до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству задекларированных жилых помещений.

Для подачи заявления необходимо: личное присутствие гражданина, паспорт (биометрический документ), справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска на имя заявителя со сверкой учетных данных, выданная **не ранее дня опубликования настоящих изменений (дополнений) к проектной декларации,** либо справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы в г. Минске на имя заявителя со сверкой учетных данных, выданная **не ранее дня опубликования настоящих изменений (дополнений) к проектной декларации.**

Договор заключается в редакции застройщика, согласованной в местном исполнительном и распорядительном органе.

Гражданин, нуждающийся в улучшении жилищных условий, вправе единожды осуществить строительство жилого помещения по договору создания объекта долевого строительства, с ограниченной прибылью застройщика, предоставив документ (справку), подтверждающую его нуждаемость.

Заявление на расторжение договора с целью замены объекта долевого строительства в пределах объекта строительства (при наличии другого объекта долевого строительства) и подача заявления на заключение нового договора осуществляется в ходе личного приема и в порядке общей очереди **по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 46, каб. 1.**

Если гражданин в течение 5 банковских дней с момента регистрации предприятием его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и предприятие оставляет за собой право заключить договор с другим претендентом по справке о нуждаемости в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи направлений администрациями районов г. Минска.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 46, каб. 2, тел.: +375 17 263-84-36, +375 29 658-00-21, +375 33 392-00-21 либо на сайте предприятия ukssov.by (раздел «Долевое строительство»).

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00223** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** РУП «Витебский ЦСМС», 210015, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 20, тел. 8 0212 48-04-19.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 01.10.2025 в 9.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1. Грузовой специальный автокран MAZ 5334 KS 3577-3-2,**
год выпуска не определен, регистрационный знак АК 8418-2, кузов (рама) 133188, цвет – синий, инвентарный № 238.
Начальная цена: 7440,00 бел. руб. с НДС.
Задаток: 744,00 бел. руб.

**Лот № 2. Грузовой бортовой тентовый UAZ 390945,**
2010 года выпуска, регистрационный знак АК 8415-2, кузов (рама) XTT390945B0408453, 330360A0429745, цвет – темно-зеленый, инвентарный № 347.
Начальная цена: 5976,00 бел. руб. с НДС.
Задаток: 597,60 бел. руб.

**Лот № 3. Обдирочно-шлифовальный станок 3Д642Е, 2000 года выпуска, инвентарный № 259.**
Начальная цена: 3900,00 бел. руб. с НДС.
Задаток: 390,00 бел. руб.

**Местонахождение имущества**:
Витебская область, г. Витебск, ул. П. Бровки, 32 В.

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 30.09.2025.**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом – Трохименко Виталий Алексеевич, тел. +375 (29) 8114445.

Извещения о проведении электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/(№ 33146), Витебского областного исполнительного комитета: https://vitebsk-region.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00222** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Лепельский ремонтно-механический завод», 211099, Витебская обл., Лепельский р-н. г. Лепель, ул. Борисовский тракт, 102, тел. 8 (02132) 3-61-86.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 30.09.2025 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.**
**Легковой минивен DODGE CARAVAN,**
рег. знак BI-2 2501, 2001 г. в.,
кузов (рама) № 1B4GP25B22B508913,
цвет – сине-зеленый металлик, инв. № 2260.

**Местонахождение имущества:**
Витебская обл., г. Лепель, ул. Борисовский тракт, д. 102.
**Нач. цена:** 4080,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.
**Задаток:** 408,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 29.09.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП, расходы на проведение независимой оценки предмета торгов. Расходы Доверителя на проведение независимой оценки составляют 250,00 (двести пятьдесят рублей 00 копеек) белорусских рублей с НДС; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты предмета электронных торгов.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: транспорт.

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 8720308.

Извещения о проведении электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/(№ 33144), Витебского областного исполнительного комитета: https://vitebsk-region.gov.by

# КАБ «БАБА ДУНЯ» БЫЛА З ХЛЕБАМ І ДА ХЛЕБА...

## Як дэпутаты выконваюць задачу Прэзідэнта

Закрыццё сельскіх крам, пратэрмінаваная прадукцыя на прылаўках і спрэчныя рашэнні ў галіне лічбавізацыі. Пытанні эфектыўнасці сістэмы гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў маштабах краіны разгледзелі 26 жніўня на нарадзе ў Прэзідэнта. Тэма, якую «Звязда» ўздымала ў мінулым выпуску «МС», заслугоўвае пільнай увагі, бо, калі ўдумацца, гаворка ідзе пра ўзровень і якасць жыцця ўсіх беларусаў, нашых бабуль і дзядуль, якія сёння застаюцца жыць у вёсцы. Падрабязней аб тым, як выконваецца задача, пастаўленная кіраўніком дзяржавы, на месцах, — у матэрыяле нашых уласных карэспандэнтаў.

### ЗАХАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ САЦЫЯЛЬНЫХ СТАНДАРТАЎ

У сельскіх населеных пунктах Лельчыцкага раёна — самага буйнога па плошчы на Гомельшчыне — нядаўна правялі маштабную праверку арганізацыі гандлёвага і медыцынскага абслугоўвання. «Для нас важна бачыць рэальную сітуацыю на месцах: што ёсць у крамах, якія цэны, у якіх умовах прымаюць людзей медыкі. Мы прыязджаем не з праверкай дзеля праверкі, а каб разумець, дзе дапамога патрэбна найбольш, — падкрэсліла **старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Таццяна БЯСПАЛАЯ,** якая ўзначаліла работу маніторынгавай групы.

Дэпутат нагадала, што маштабны маніторынг у Лельчыцкім раёне быў арганізаваны згодна з выкананнем даручэння кіраўніка дзяржавы, а таксама старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана Крупко па паляпшэнні якасці жыцця ў сельскай мясцовасці. Дарэчы, у склад міжведамаснай групы ўвайшлі не толькі прадстаўнікі раённага кіраўніцтва, але і ключавыя спецыялісты: супрацоўнікі санітарнай службы, аддзела эканомікі, старшыні сельскіх выканаўчых камітэтаў, а таксама старэйшыны населеных пунктаў. Такі шырокі склад дазволіў атрымаць максімальна аб'ектыўную карціну і ўлічыць меркаванне саміх вяскоўцаў.

За два дні работы маніторынгавай групы былі правераны гандлёвыя аб'екты ўсіх форм уласнасці — як дзяржаўныя, так і прыватныя крамы, а таксама аўтакрамы, што абслугоўваюць аддаленыя вёскі. Асаблівую ўвагу звярнулі на наяўнасць сацыяльна значных тавараў: хлеба, малака, круп, мясных і рыбных вырабаў, садавіны і агародніны. «Жыхары нашых сельскіх населеных пунктаў, з якімі мы ў абавязковым парадку размаўлялі падчас маніторынгу, адзначалі, што задаволеныя абслугоўваннем і асартыментам тавараў. Так, сёння сельскі пакупнік хоча мець выбар прадуктаў, і гэты выбар у большасці выпадкаў ёсць»,— адзначыла Таццяна Бяспалая.

Яна дадала, што маніторынг гандлёвага абслугоўвання ў раёне ахапіў шырокае кола пытанняў: захаванне рэжыму работы, дакладнасць графікаў і маршрутаў руху аўтакрам, якія забяспечваюць таварамі самыя аддаленыя населеныя пункты, наяўнасць у рэалізацыі сацыяльна значных тавараў, у тым ліку прадукцыі айчыннай вытворчасці, што асабліва важна для падтрымання асартыменту і цэнавай даступнасці. «Падчас маніторынгу пільную ўвагу ўдзялілі таксама недапушчальнасці наяўнасці ў продажы тавараў са скончаным тэрмінам годнасці, што з'яўляецца прынцыповым патрабаваннем да якасці і бяспекі прадукцыі. Была вывучана эфектыўнасць выкарыстання і стан аб'ектаў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, а таксама стан неэксплуатаваных аб'ектаў для далейшай працы з імі», — звярнула ўвагу дэпутат.

Не менш важная частка маніторынгу — праверка работы сельскіх фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Увагу звярнулі на забеспячэнне медпрэпаратамі,



захаванне санітарных патрабаванняў, умовы для прыёму пацыентаў. Таццяна Бяспалая падкрэсліла, што ФАПы з'яўляюцца пачатковым кантактам з медыцынай для жыхароў аддаленых населеных пунктаў: «Нашая задача — каб чалавек быў упэўнены: калі будзе неабходна, ён атрымае кваліфікаваную дапамогу. Па словах мясцовых жыхароў, фельчары заўсёды на сувязі, дапамагаюць і ў паўсядзённых сітуацыях, і калі патрэбна тэрміновая кансультацыя».

Па выніках маштабнага маніторынгу група аб'ехала ўсю сельскую тэрыторыю Лельчыцкага раёна. У цэлым работа гандлёвых і медыцынскіх аб'ектаў прызнана належнай. Па асобных пытаннях дадзены рэкамендацыі, каб зрабіць абслугоўванне яшчэ больш зручным для вяскоўцаў. «Мы бачым, што сістэма працуе. Але заўсёды ёсць месца для ўдасканалення. І калі людзі падказваюць, што можна палепшыць, гэта для нас галоўны арыенцір», — падагульніла старшыня Лельчыцкага райсавета.

### ЗДАРОВАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ ПАТРЭБНА!

Аб падыходах у арганізацыі гандлёвага абслугоўвання насельніцтва размова ішла ў Гродзенскай вобласці падчас выязнога практычнага семінара для старшынь сельскіх Саветаў дэпутатаў і выканаўчых камітэтаў. Работу сістэмы прадэманстравалі на прыкладзе аграгарадкоў Малая Бераставіца і Вялікія Эйсманты.

Адзін з асноўных прынцыпаў работы гандлю ў Бераставіцкім раёне — наяўнасць і дзяржаўных, і прыватных крам у населеных пунктах. Адміністрацыя раёна зазначае, што здаровая канкурэнцыя важная і дапамагае трымаць гандлёвыя аб'екты ў тонусе. А ў насельніцтва шырэйшы выбар, што таксама добра, таму прыватных прадпрымальнікаў тут падтрымліваюць. «Ні для каго не сакрэт, што гандлёвае абслугоўванне — гэта адзін з ключавых фактараў у забеспячэнні жыццядзейнасці насельніцтва. Гандлёвае абслугоўванне ў Бераставіцкім раёне аказваюць 203 крамы рознічнага гандлю, з іх 47 размешчаны ў сельскай мясцовасці. Даручэнне кіраўніка дзяржавы «Дайсці да кожнага», вядома, стараемся выконваць», — адзначыла **намеснік старшыні Бераставіцкага райвыканкама Ала ЗАМІРОЎСКАЯ.**

У склад Малабераставіцкага сельсавета ўваходзіць 14 населеных пунктаў, у якіх пражывае больш за 1,4 тысячы чалавек, больш за 70 % — у адміністрацыйным цэнтры сельсавета, але гэта не значыць, што ў астатніх населеных пунктах гандлёвае абслугоўванне горшае. На тэрыторыі сельсавета 7 крам, 2 кіёскі і, вядома, працуе аўтакрама (па усім раёне). У Эйсмантаўскі сельсавет уваходзіць 16 населеных пунктаў, іх абслугоўваюць 5 магазінаў, 3 з іх — прыватныя.

У апошні час тэма гандлю на слыху, можа здацца, што яна не глабальнага характару, што людзей больш хвалюе тое ж ЖКГ. Але ,насамрэч, даступнасць тых ці іншых тавараў вызначае якасць жыцця, асабліва ў тых населеных пунктах, дзе пражываюць 100, 50, 20 чалавек. Зразумела, што ў вёсцы, дзе жыве 20 чалавек, краму трымаць нерэнтабельна, таму так актыўна выкарыстоўваюцца аўтакрамы.

Гандлёвыя пункты прапануюць шырокі асартымент прадукцыі — ад прадуктаў харчавання да тавараў для дома. Гэта дазваляе жыхарам вёскі мець доступ да якасных тавараў першай неабходнасці і эканоміць час на паездках у буйныя гарады. Акрамя таго, сучасныя гандлёвыя аб'екты аснашчаны ўсім неабходным абсталяваннем для зручнасці пакупнікоў. Камфортныя ўмовы і ветлівы персанал ствараюць прыемную атмасферу і садзейнічаюць росту даверу да мясцовых пунктаў продажу. Даступнасць тавараў садзейнічае стварэнню больш камфортных умоў жыцця ў вёсцы і робіць яго больш прывабным для маладых спецыялістаў і іх сем'яў.

Дзякуючы граматнай арганізацыі гандлю ў вёсцы жыхары могуць быць упэўнены, што ўсе іх патрэбнасці будуць задаволены. Гэта яшчэ адзін крок да стварэння сучаснай і камфортнай сельскай прасторы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота «Бераставіцкая газета».**

# У ФАРМАЦЕ ПАСТАЯННАГА ДЫЯЛОГУ

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

**Дэпутат Валерый МАЛАШКА пра работу з выбаршчыкамі, заканатворчую дзейнасць, захаванне памяці.**



Для старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валерыя Малашкі ўзаемадзеянне з людзьмі заўсёды было на першым плане. І калі ён працаваў галоўным урачом Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы, і калі быў намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама па сацыяльных пытаннях, і калі займаў міністэрскія пасады. Сёння ён прадстаўляе ў парламенце чатыры раёны — Бялыніцкі, Круглянскі, Шклоўскі і часткова Магілёўскі (Шклоўская акруга № 90), дзе ў агульнай колькасці жыве каля 56 тысяч чалавек. І назва камісіі, якую ўзначальвае народны выбраннік, яскрава сведчыць, па якіх прыярытэтных кірунках вядзе ён сваю дэпутацкую дзейнасць, у тым ліку і ў сваёй акрузе.

## «ДАНЕСЦІ ПРАЎДЗІВУЮ ІНФАРМАЦЫЮ»

У рабоце з людзьмі для парламентарыя гэта вельмі важна. Каб не было скажэнняў і перайначвання таго, што гаворыць і робіць Прэзідэнт. На сустрэчах з выбаршчыкамі, у працоўных калектывах абмяркоўваюцца геапалітычнае становішча ў свеце, сітуацыя ў нашай краіне, выкананне сацыяльных стандартаў. Неаднаразова падымалася і актуальная тэма абгрунтаванасці росту цэн і недастатковага асартыменту ў сельскіх крамах, на што нядаўна звяртаў увагу Аляксандр Лукашэнка.

— Нашы грамадзяне актыўныя, яны хочуць ведаць і пра міжнародную абстаноўку, і як мы будзем рэагаваць на знешнія выклікі, — кажа суразмоўнік. — Гэта значыць, ім не ўсё роўна, што адбываецца ў краіне. Дзень народнага адзінства, які мы адзначаем 17 верасня, — вельмі сімвалічнае свята. І важнае для людзей. Пра гэта кажуць і мае выбаршчыкі. Яно сапраўды адлюстроўвае сённяшнія думкі і спадзяванні беларусаў.

У Беларусі шмат што робіцца для падрастаючага пакалення. Нядаўна дэпутаты назіралі за тым, як ідзе падрыхтоўка да новага навучальнага года ўстаноў адукацыі. Сёлета ў рамках інвестыцыйнай праграмы Шклоўскага раёна праведзена маштабная рэканструкцыя школы № 4 у Шклове. Былі пашыраны яе плошчы, абнавілася абедзенная зала, у харчблоку ўстаноўлена сучаснае тэхналагічнае абсталяванне. Валерый Малашка ацаніў змяненні на выдатна.

— Адукацыя — стратэгічны кірунак развіцця дзяржавы, — гаворыць ён. — Камфорт, бяспека і якасць харчавання — неад'емная частка школьнага асяроддзя. Менавіта такія праекты паказваюць, як шмат увагі ўдзяляецца ў нашай дзяржаве клопату пра будучыню. Нашы дзеці заслугоўваюць найлепшага!

Больш за 10 гадоў Валерый Малашка супрацоўнічае з Бялыніцкай спецыяльнай школай-інтэрнатам. Штогод тут атрымліваюць якасную адукацыю амаль 100 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. На Дні ведаў дэпутат перадаў дырэктару ўстановы Аляксандру Мамчанку сертыфікат на суму 800 рублёў на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

— Дзяржава клапоціцца пра тое, каб дзеці нічым не былі абдзелены, — адзначыў суразмоўнік. — Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь замацаваны прынцып інклюзіі. Яго рэалізацыя — адзін з асноўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі.

## ПЫТАННІ — НА КАНТРОЛІ

Неад'емны складнік работы дэпутата Палаты прадстаўнікоў у сваёй акрузе — прыём грамадзян. Падчас апошняга да Валерыя Малашкі звярнуліся 10 чалавек. Пытанні датычыліся ўтрымання могілак, якасці вады, камунальных паслуг, аховы здароўя.

**— Наша задача, і нас на гэта арыентуе Прэзідэнт, — пачуць кожнага і падказаць выйсце, — адзначае суразмоўнік. — Заяўнікам даюцца неабходныя тлумачэнні, некаторыя звароты накіроўваюцца ў кампетэнтныя дзяржаўныя органы і арганізацыі. Ад мяне патрабуецца пракантраляваць працэс і, калі трэба, пасадзейнічаць вырашэнню праблемы ў рамках заканадаўства.**

## СТАЎКА НА МОЛАДЗЬ

Нядаўна ў Магілёве праходзіў міжнародны фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». Ён быў прысвечаны 80-годдзю Вялікай Перамогі. Адной з тэм было асэнсаванне ролі моладзі ў захаванні і абароне гістарычнай памяці.

— Гэта вельмі важная тэма, якая блізкая кожнаму беларусу і расіяніну, — канстатуе Валерый Малашка. — Падзялюся асабістым. Летась у Міжнародны дзень міру ў вёсцы Рубеж Бялыніцкага раёна быў урачыста адкрыты памятны знак ахвярам Вялікай Айчыннай вайны — камень з імёнамі мясцовых жыхароў, якія загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На тым помніку прозвішча Малашка згадваецца 10 разоў. Сярод ахвяр быў і мой прапрадзед. Такія помнікі фіксуюць факты генацыду, нагадваюць пра той жах, які перажылі нашы продкі. Абавязак — не дапусціць больш такой бяды. Памяць, якую мы захоўваем, працягне жыць у нашчадках.

## КАБ ЗАКОНЫ ПРАЦАВАЛІ

Законапраекты камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы наўпрост датычацца кожнай сям'і, кожнага дзіцяці. На працягу года камісіяй іх было падрыхтавана тры: «Аб змяненні законаў па пытаннях дзярждапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», «Аб змяненні законаў па пытаннях прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўнагадовых», «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей». Парламентарый звяртае ўвагу на тое, што работа ў акрузе дапамагае лепш асэнсаваць праблемныя месцы і пры стварэнні законапраектаў улічыць іх.

— Кіраўнік дзяржавы асабліва адзначае важнасць нашай работы ў акругах, і гэта нас шмат да чаго абавязвае, — кажа ён. — Падчас работы над праектам закона аб правах дзіцяці мы шмат размаўлялі і з педагогамі, і з бацькамі на розныя надзённыя тэмы, у тым ліку пра неабходнасць забароны на распаўсюджванне сумнеўных цацак у выглядзе герояў камп'ютарных гульняў і фільмаў, пра абарону ад інфармацыі, якая наносіць шкоду здароўю дзіцяці, асабістай адказнасці педагогаў аб недапушчальнасці парушэння правоў непаўналетняга. Без гэтых абмеркаванняў тыя навелы, якія ляглі ў наш законапраект, былі б няпоўныя. Закон падпісаны кіраўніком дзяржавы і на поўную моц запрацуе ўжо ў наступным годзе. Ён узмацняе гарантыі рэалізацыі правоў дзяцей ва ўсіх сферах: ад інфармацыйнай бяспекі да кадравай палітыкі. Сёння дэпутаты нашай камісіі выходзяць з рознымі цікавымі прапановамі да законапраекта «Аб валанцёрскай дзейнасці». Дарэчы, нядаўна на рабочай нарадзе на базе Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі абмяркоўвалі ў тым ліку і ролю валанцёраў у сістэме аховы здароўя. Напярэдадні нас чакае сур'ёзная работа па ўнясенні змяненняў у Кодэкс аб ахове здароўя. Гэта будзе ўнікальны дакумент, які аб'яднае каля васьмі дзеючых сёння ў гэтай галіне законаў. Будзем сустракацца з прафесійнай суполкай, размаўляць са звычайнымі грамадзянамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**




ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Агронёманский», УНП 600014486, 222961, Минская обл., Столбцовский р-н, с/с Новосверженский, аг. Старый Свержень, ул. Комарова, д. 1 |

**Первые повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении аукциона опубликовано 22.05.2025 в газете «Звязда» № 97 (30485), стр. 9**

**Предмет электронного аукциона**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | Погрузчик «Амкодор-332С-01», рег. знак ОВ-5 0334, местонахождение: Минская обл., Столбцовский р-н, д. Скоморошки, территория МТП | 34 848,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона, но не менее 200,00 бел. руб.**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 30.09.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 17.09.2025 по 29.09.2025 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Открытое акционерное общество

